ЗЬВЯЗДА

№ 26 (3534) Субота, 1 лютага 1930 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 83.
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731.

быты «Таварыствам прыяцеляў Савецкага Саюзу» для СССР, накіраваны ў Назарасійск, адкуль будуць перасланы ў калгас «Краіна Саветаў» ў Ніжня-Волскі край. «Таварыства прыяцеляў Савецкага Саюзу» зьбірае сродкі для куплі яшчэ 4-х трактараў і 4-х плугоў для аднаго з падмаскоўскіх калгасаў.

студзеня кулакі падпалілі хату члена ... скага сельсавету. У хаце начавалі рабочыя-брыгадзіры. Па справе арыштавана 5 чалавек.

УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ЯШЧЭ БОЛЬШ УПАРТА І НАСТОЙЛІВА БУДАВАЦЬ НОВЫЯ КАЛГАСЫ

Раскулачваньне—вынік і складаная частка калектывізацыі

ЗА НОВЫЯ КАЛГАСЫ

Хваля калектывізацыі ідзе ўгару. Пакіпуты ззаду ўсе ранейшыя меркаваньні. Жыцьцё выперадзіла нашыя пляны. Нашыя магчымасьці ў галіне разгортваньня калектывізацыі і будаўніцтва новых калгасаў аказаліся большымі, чым мы меркавалі. Вёскі, раёны, округі — уся Савецкая Беларусь ужо ўкрыта вялізарнаю сеткаю калгасаў. Апартуністыя, малаверы аказаліся бітымі. Пляны калектывізацыі, вызначаныя студзеньскім пленумам ЦК на весну гэтага году, ужо ў асноўным выкананы. Ёсьць цэлы рад раёнаў і округ, якія ўжо перавыканалі гэтыя заданьні.

Задачай дня зьяўляецца **яшчэ больш узмацніць тэмп калектывізацыі, яшчэ больш упарта і настойліва будаваць новыя калгасы.** Патрэбна самая жорсткая барацьба з усякімі спробамі абмежаваць тэмп калектывізацыі, затрымаць будаўніцтва новых і новых калгасаў.

Бурны рост калгасаў на падставе масавае калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на падставе вялізарнага ўздыму актыўнасьці, у першую чаргу вясковае беднаты даў магчымасьць паставіць пытаньне аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. Тое, што мы ўжо маем магчымасьць замяніць кулацкі хлеб хлебам калгасаў і саўгасаў, азначае магчымасьць канкрэтнага ажыцьцяўленьня задачы па раскулачваньні кулацтва. Без вялізарнага ўздыму калгаснага руху, пры адсутнасьці магчымасьці замяніць кулацкі хлеб хлебам саўгасаў і калгасаў, мы ня здолелі-б паставіць і вырашаць задачы ліквідацыі кулацтва, як клясы. Толькі магутны ўздым палітычнае актыўнасьці беднаты, умацаваньне саюзу з серадняком, на падставе масавае калектывізацыі сельскае гаспадарчае даюць гарантыю ў тым, што ліквідацыя кулацтва, як клясы, будзе заведзена шпарка і рашуча.

Усё гэта нас павінна пераканаць, **наколькі цесна зьвязана задача калектывізацыі сельскае гаспадаркі з задачаю ліквідацыі кулака, як клясы. Раскулачваньне ёсьць вынік і складаная частка работы па калектывізацыі.**

Трэба завастрыць увагу ўсіх партарганізацый, усіх членаў партыі на неабходнасьць павялічэньня тэмпу калектывізацыі, на патрэбу максымальнае ўвагі будаўніцтву калгасаў там, дзе іх няма. Усё гэта патрэбна для таго, каб забясьпечыць выкананьне першачарговае задачы — ператварыць Беларусь у раён суцэльнае калектывізацыі.

Задачы па раскулачваньні павінны быць падпарадкаваны задачам па калектывізацыі. Сам працэс раскулачваньня павінен не папераджаць арганізацыю калгасу, **а павінен быць вынікам актыўнага будаўніцтва калгасаў батрацка - бядняцка - серадняцкімі масамі.**

Паскарэньне працэсу раскулачваньня павінна ісьці **не за лік паслабленьня непасрэднае работы па будаўніцтве новых калгасаў,** не за лік затрыманьня ўцягненьня ў калгасы, якія ўжо ёсьць, батракоў, беднякоў і сераднякоў, а наадварот — патрэбна яшчэ больш агітаваць, пераконваць, заклікаць у калгасы, патрэбна яшчэ больш узмацніць тэмп будаўніцтва новых калгасаў. Трэба падкрэсьліць, што мэтады адміністраваньня ў адносінах уцягваньня ў калгасы, якія ў некаторых мясцох у нас здараюцца, павінны быць рашуча адхілены.

Усямернае ўзмацненьне і палепшаньне нашае працы з вясковаю беднатою, узмоцненае будаўніцтва новых калгасаў і раскулачваньне іменна ў сувязі з гэтым ростам калгаснага руху — такія нашыя бліжэйшыя і важнейшыя задачы, на вырашэньне якіх трэба мабілізаваць увагу партыйных арганізацый.

Бальшавіцкае прывітаньне дэлегатам-калгасьнікам

Барацьбітом за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі—перай акруговай канфэрэнцыі калгасьнікаў ад Менскага акруговага камітэту (б)Б — **бальшавіцкае прывітаньне!**

Камуністычная партыя, а пад яе кіраўніцтвам рабочая кляса пры апора беднату ў саюзе з серадняком ажыцьцяўляюць на справе нячуванае сваіх тэмпах і размаху сацыялістычнае будаўніцтва нашае краіны.

Пабудаваньне сацыялізму ўжо «ня пытаньне вельмі далёкага будучаго, пабудаваньне сацыялізму — пытаньне бліжэйшых гадоў.

Акруговая канфэрэнцыя калгасьнікаў склікаецца ў гістарычны пэрыяд, ці наша партыя перайшла ад палітыкі абмежаваньня капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі, да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. Сапраўдная перабудова соцень і тысяч дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак на грунце калектывізацыі і арганічна з ёю зьвязаная палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, выклікае шалёнае супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў, контр - рэвалюцыйных элемэнтаў вёскі калгаснаму будаўніцтву.

Усё гэта патрабуе яшчэ большага згуртаваньня батрацка - бядняцкага вакол генэральнай лініі партыі, яшчэ большага ўзмацненьня кіруючай ролі пралетарыяту, узмацненьня работы саветаў.

Калгасны рух, які разгарнуўся, усё ўзрастае і ахапляе шырокія колы батракоў, беднякоў і сераднякоў, дае магчымасьць поўнасьцю калектывізаваць бядняцка - серадняцкія гаспадаркі округі да канца 1931 году.

У сувязі з гэтым перад канфэрэнцыяй стаіць важнейшая задача — значыць практычныя шляхі ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, значыць мерапрыемствы па якасным паляпшэньні работы калгасаў, дальнейшым іх колькасным росьце, абагуленьні сродкаў вытворчасьці калгасаў, поўнага выкананьня заданьня па пасеўнай кампаніі 1930 г.

Акруговы камітэт КП(б)Б упэўнены, што задачы, якія стаяць перад канфэрэнцыяй, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, будуць выкананы.

МЕНСКІ АКРУГОВЫ КАМІТЭТ КП(б)Б.

Да менскай акруговай канфэрэнцыі калгасьнікаў

Сёньня адкрываецца першая акруговая канфэрэнцыя калгасьнікаў Менчыны. Сходы і раённыя канфэрэнцыі якія былі праведзены перад канфэрэнцыяй, выявілі, што побач са значнымі дасягненьнямі ў адносінах калектывізацыі сельскае гаспадаркі — да сёньняшняга дня абагулена каля 35 проц. карыснае сельска - гаспадарчае надлішчы округі, — ёсьць рад буйных недахопаў у рабоце саміх калгасаў, асноўныя з якіх наступныя: слабае абагуленьне маемасьці, асабліва жывёлы і насеньня, слабая ачыстка насеньня — дагэтуль ачышчана толькі 20 проц., — дрэннае правядзеньне рамонту с.-г. інвэнтару і г. д.

Гэтыя недахопы здараюцца таму, што дагэтуль слаба разгорнута работа сярод батрацтва і беднаты, некаторыя ячэйкі пасьўна адносяцца да гэтае работы, недаацэньваюць яе важнасьці, праяўляюць па сутнасьці правы ўхіл на практыцы.

Калгасны рух ахапіў асноўныя пласты батракоў, беднякоў і сераднякоў. Няма такое вёскі ў Менчыне, дзе ня было-б батрацка-бядняцкай ініцыятыўнай групы па арганізацыі калгасаў. У калгасы пайшоў серадняк. Калгасны рух зараз зьяўляецца сапраўдным масавым рухам бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі шчыльна зьвязана з задачай ліквідацыі кулацтва, як клясы, яна праходзіць і будзе праходзіць ва ўмовах абвострэнай і бязьлітаснай клясавай барацьбы. Таму, канфэрэнцыя калгасьнікаў павінна будзе з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, наладжваньне прадукцыйнае работы ў калгасах магчымы толькі на аснове самай адданай і настойлівай работы па арганізацыі бядняцка - батрацкага ядра ў калгасах.

— Прыцягненьне беднаты да кіруючай работы ў калгасах, барацьба з распродажам жывёлы, абагуленьне ўсяе маемасьці калгасьнікаў, разгортваньне культурна - масавай работы ў калгасе, паляпшэньне бытавых умоў калгасьнікаў, найлепшая арганізацыя гаспадарчай работы ў калгасах — над гэтымі пытаньнямі павінна папрацаваць акруговая канфэрэнцыя.

— Мыксымальнае ўзмацненьне тэмпаў сацыялістычнай перабудовы дзесяткаў тысяч дробных індывідуальных гаспадарак Менчыны, найлепшая арганізацыя рабочае сілы ў калгасах, абагуленьне сродкаў вытворчасьці, у першую чаргу жывёлы, пашырэньне пасеўнае плошчы калгасаў на 4 з палов. проц., павышэньне ўраджайнасьці на 28 проц., ачыстка насеньня і абмен яго на добрагатунковае, дапамога вясковым арганізацыям і ўстановам у правядзеньні раскулачваньня ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, найбольш мэтазгоднае скарыстаньне адабраных у кулакоў жывёлы, с.-г. машын, пабудоў і г. д. — вось асноўныя задачы, якія стаяць перад калгасамі Менскай акругі.

Канфэрэнцыя разгледзіць тры пытаньні: даклад тав. Славінскага аб чарговых задачах калектывізацыі сельскае гаспадаркі, тав. Карапеўскага — аб правядзеньні веснавое сяўбы ў калгасах і тав. Цыпкова — аб арганізацыі працы і аплаце яе ў калгасах.

ТАМАШЭЎСКІ.

Арганізуем калгасныя газэты

Рэдакцыя газэты „Зьвязда" арганізуе ў раёнах суцэльнае калектывізацыі раённыя калгасныя друкаваныя газэты

Надаючы вельмі важнае значэньне рабоце селькораў і нізавога друку ў калгасах, як сапраўднаму памочніку партыі ў справе вырашэньня ўсіх задач, зьвязаных з правядзеньнем веснавое пасеўнае кампаніі, далейшым пашырэньнем калгаснага руху, задачай ліквідацыі кулацтва, як клясы, узмацненьнем існуючых калгасаў і раёнаў суцэльнае калектывізацыі, мабілізацыяй батрацка - бядняцка-серадняцкіх мас вакол ажыцьцяўленьня задач партыі, — рэдакцыя газэты «Зьвязда» бярэ на сябе абавязак арганізаваць у лютым месяцы г. г. дзьве раённыя калгасныя (у раёнах суцэльнае калектывізацыі) друкаваныя газэты, з якіх — адну ў Магілеўскай акрузе і другую ў Менскай.

Для правядзеньня гэтае работы рэдакцыя з свайго боку вылучае, за свой кошт, аднаго адказнага працаўніка рэдакцыі на 3 месяцы, які ў працягу гэтага часу працуе рэдактарам раённае калгаснае друкаванае газэты, а таксама рэдакцыя бярэ на сябе частку выдаткаў па выданьні дзьвёх газэт (на працягу 3-х месяцаў, забясьпечваючы арганізацыю афармленьня гэтых газэт): набор, друк, забесьпячэньне газэтнаю паперою і г. д.

Акрамя таго, рэдакцыя бярэ на сябе яшчэ наступныя абавязкі:

1. Наладзіць рэгулярнае выданьне нова арганізаваных друкаваных газэт ня менш, чым два разы ў месяц.

2) Падрыхтаваць, на зьмену вылучанаму рэдакцыяй рэдактара газэты з мясцовых работнікаў (райком КП(б)Б павінен будзе адразу-ж вылучыць з мясцовых работнікаў намесьніка рэдактара, які і падрыхтоўваецца да абавязкаў рэдактара).

3) Разам з райкомам КП(б)Б арганізаваць ВА ЎСІХ КАЛГАСАХ (гэтых двух раёнаў) насьценгазэты, вакол якіх згрупаваць селькораў.

4) Пасьля 3-хмесячнага тэрміну рэдакцыя «Зьвязды» абавязваецца трымаць цесную сувязь з арганізаванымі друкаванымі газэтамі і дапамагаць ім.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу рэдакцыі газэт: «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Октябрь», «Беларуская Вёска», «Чырвоная Зьмена», «Полесская Правда», «Віцебскі Пралетары».

РЭДАКЦЫЯ ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА».

Провады 400 рабочых, якія едуць на работу ў калгасы

450 рабочых вагонных майстэрань падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў КП(б)Б

Учора ў Доме Камуністычнае Асьветы адбыўся вечар, прысьвечаны провадам рабочых, якія едуць на пастаянную работу ў калгасы.

У прэзыдыум сходу былі абраны члены бюро ЦК і Менскага АК КП(б)Б, члены прэзыдыуму ЦКК, МенАКК, бюро ЦК камсамолу Беларусі, члены ЦСПСБ і прадстаўнікі ад менскіх заводаў і фабрык і ад рабочых, якія едуць на работу ў калгасы.

На вечары з вялікай прамовай выступіў сакратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б тав. Гэй, які спыніўся на задачах, якія стаяць перад ад'яжджаючымі на вёску таварышамі. Тав. Гэй выказаў цьвёрдую ўпэўненасьць што задачы, ускладзеныя на ад'яжджаючых рабочых па сацыялістычнай перабудове вёскі, арганізацыі батрацтва і беднаты, разгортваньні калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы будуць цалкам і поўнасьцю ажыцьцёўлены.

З прывітаньнямі выступілі таксама т. т. Славінскі, Рыжоў, Галадзед, Бэрман (фабрыка «Кастрычнік»), Шэўчын (завод «Энэргія»), Войтасевіч (завод «Камунар»), Супрун (Чырвоная армія) і г. д.

Выступіўшы з прывітаньнем ад рабочых - чыгуначнікаў тав. Стратаў паведаміў, што 450 рабочых вагонных майстэрань падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў рады КП(б)Б.

Ад імя рабочых, якія едуць на работу ў калгасы, выступілі т. т. Сухараў, Эльпер, Бабкоў, Лойка і г. д.

Вечар закончыўся вялікай канцэртнай часткай. Падрабязная справаздача аб провадах будзе зьмешчана ў заўтрашнім нумары «Зьвязды».

ЗА ПАРЫЖАМ—БЭРЛІН

Цынічнымі, ідыёцкімі паклёпамі па адрасе Савецкага Саюзу банда міжнародных машэньнікаў падрыхтоўвае апраўданьне белагвардзейцаў-фальшываманэтчыкаў

БЭРЛІН, 30. Сёньня пасьля допыту вядомага фашыстага Эрхарта ў якасьці сьведкі па справе аб фальшывых чырвонцах, выступілі абаронцы падсудных «з выкрыцьцем» па адрасе ўраду СССР, у якім савецкаму ўраду прад'яўляецца абвінавачаньне ў тым, што ён нібы распаўсюджвае фальшывыя грошы за граніцай.

Абаронца падсуднага грузінскага белагвардзейца Садатэрашвілі Бэр зачытвае доўгую заяву, у якой гаворыцца, што ў 1928 годзе Палітбюро ЦК партыі пастанавіла арганізаваць фабрыкацыю ангельскай, амэрыканскай і мэксыканскай валюты па выпадак вайны з Кітаем. Фальшывыя грошы друкаваліся ў Ленінградзе і у «вялікім горадзе на Доне».

Далей заява сьцьвярджае, быццам спачатку вялікая колькасьць фальшывых ангельскіх і амэрыканскіх грошай была перадана ў Манголію генэралу Фыпу. Кітайцы нібы канфіскавалі ў консульстве СССР вялікую колькасьць фальшывых грошай. Пазьней савецкі ўрад распаўсюджваў, паводле цьверджаньня Бэра фальшывыя грошы ў каленіях, у прыватнасьці, у Сіаме, у Індыі, на Блізкім Усходзе, у Паўднёвай Амэрыцы, у Мэксыцы, у Паўночнай Афрыцы, а пачынаючы ад лета 1929 году ў Эўропе, у прыватнасьці —у Польшчы, Нямеччыне, Галяндыі, Італіі і Грэцыі.

Зразумела, у заяве Бэра не прапушчаны абавязковыя расказы аб «жахах ЧК» у выглядзе таго, што некі фантастычны «фінансавы прадстаўнік савецкага ўраду ў Белградзе» быў расстрэляны ў Маскве за адмову ўзяць на сябе распаўсюджваньне фальшывых ангельскіх банкнотаў у Лёндане.

Заява заканчваецца сьцьвярджэньнем, што фальшывыя доляры, якія паявіліся ў вялікарнай колькасьці, паходзяць з тых-жа савецкіх фабрык.

Пасьля сваёй заявы, поўнай нязграбнай, ідыёцкай і цынічнай брахні, Бэр прапануе патрабаваць афіцыйнага тлумачэньня ад сав. ураду адносна яго «выкрыцьця». Пракурор выступае супроць гэтай прапановы абароны. Абаронцы ставяць у прыклад выпік парыскага працэсу і прапануюць суду паступіць такім-жа чынам.

Суд, які спакойна выслухаў антысавецкія выпады і паклёпы абароны, пасьля парады, якая працягвалася некалькі гадзін, вынес наступную пастанову:

«Суд прызнае даведзеным, што падробка грошай ўжывалася, як сродак барацьбы паміж дзяржавамі, але адхіляе расьсьледваньне гэтых фактаў, як не належачых да справы».

Пасьля гэтага пракурор задае некалькі пытаньняў, якія маюць адносіны да ленінградзкага працэсу белагвардзейцаў - фальшываманэтчыкаў. Карумідзе прызнае сваё знаёмства з Зівэртам, але, зразумела, адхіляе якія-небудзь размовы з ім аб чырвонцах.

Наступнае пасяджэньне ў панядзелак.

„ГАЛОДНЫ ПАХОД" на Гамбург

КРЫВАВЫЯ ЦЭРГІБЭЛІ ЖОРСТКІМ ТЭРОРАМ ІМКНУЦЦА САРВАЦЬ ПАХОД

БЭРЛІН, 29. Ня гледзячы на забарону паліцэйскае ўлады, беспрацоўныя паўночнае Нямеччыны пачалі «галодны паход» на Гамбург (буйнейшы партовы горад паўночнае Нямеччыны). Калёны беспрацоўных выйшлі з раду гарадоў з тым, каб прыйсьці ў Гамбург да 1-га лютага. Ва ўсіх гэтых раёнах паліцыя заняла шляхі, якія вядуць у Гамбург, прабуючы затрымаць паход беспрацоўных. У многіх мясцох сярод беспрацоўных праведзены масавыя арышты.

КРЫВАВЫЯ СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ

БЭРЛІН, 30. У Гамбургу адбываюцца сур'ёзныя сутычкі беспрацоўных рабочых з паліцыяй, на чале якой стаіць сацыял - дэмакрат Шэнфэльдэр. За ўчарашнім і сёньнешні дзень ва многіх мясцох Гамбургскае вобласьці былі затрыманы атрады беспрацоўных, якія ідуць у Гамбург. У самым Гамбургу паліцыя напала на беспрацоўных, якія сабраліся каля біржы працы. Рабочыя аднэй пабудовы, якая знаходзіцца побач з біржаю працы, пачалі пратэставаць супроць паліцэйскае расправы над бязбройнымі беспрацоўнымі. Тады паліцыя накіравала свае дзеяньні і супроць будаўнікоў. Усе рабочыя, занятыя на пабудове, зараз-жа салідарызаваліся з таварышамі, якія знаходзіліся ў небясьпецы і закідалі паліцыю цэглаю. Паліцэйскія адкрылі агонь па пабудове. Рабочыя тут-жа кінулі працу, абвясьцілі забастоўку пратэсту і паставілі ўмоваю для аднаўленьня працы, неадкладны вывад паліцыі з раёну пабудовы. Забастоўка працягваецца.

На пасяджэньні бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Учора на пасяджэньні бюро Фрунзаўскага райкому КП(б)Б абгаворваліся пытаньні, зьвязаныя з сьвяткаваньнем 5-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА *).

Па інфармацыі, зробленай сакратаром ячэйкі БДВ т. Курцікам, разгарнуліся шырокія спрэчкі, у якіх прымалі ўдзел т. т. ШЛЭКТАРАЎ, БУДЗІНСКІ, БРЭНЭЗІН, КІНЭР, КАЖДАН, ПЯТУШКОЎ, КАНАКОЦІН, ГУРЭВІЧ і інш.

Таварышы, якія выступалі, рэзка асудзілі палітычныя памылкі Белдзяржвыдавецтва, паказваючы, што яны зьяўляюцца вынікам нязжытых яшчэ кіраўніцтвам БДВ нацыянал - дэмакратычных установак.

Бюро Фрунзаўскага райкому вынесла пастанову па гэтым пытаньні, якая будзе зьмешчана ў бліжэйшым нумары «Зьвязды».

*) Гл. «Зьвязду» № 25, ад 31-га студзеня г. г. артыкул «БДВ ва «пераломе» і пастанову бюро ячэйкі БДВ.

100 ТЫСЯЧ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ ВЁСКІ —З ЧЫРВОНААРМЕЙСКАГА АКТЫВУ

Пастанова Рэсвваенсавету СССР аб удзеле Чырвонай армеі ў калгасным будаўніцтве краю

Вялізарны размах сацыялістычнае ліквідацыі сельскае гаспадаркі, новая палітыка партыі на ліквідацыю кулака, як клясы, ставіць перад Чырвонай армеяй пановаму і значна з большаю сілаю, чым да гэтага часу, задачу падрыхтоўкі з чырвонаармейцаў перадавых арганізатараў калгасаў, будаўнікоў сацыялістычнага земляробства, байцоў на фронце ліквідацыі кулака, як клясы, з тым, каб у выпадку баявое трывогі яны зноў вярнуліся з заводаў, калгасаў і саўгасаў у рады Чырвонае армеі. Рэсвваенсавет Саюзу, ставячы гэту задачу перад Чырвонай арміяй і флётам, у той-жа час прапануе ўсім чырвонаармейцам, чырвонафлётцам, камандзірам і палітработнікам ні на хвіліну не забываць і цьвёрда памятаць, што асноўная і галоўная мэта ўсяе іх работы і вучобы ў Чырвонай армеі — падрыхтаваць высока - кваліфікаванага ў ваенных адносінах і палітычна пісьменнага байца, здольнага са зброяй у руках змагацца за справу сацыялізму.

Таму, уся падрыхтоўка ў армеі кадраў для розных вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва павінна праводзіцца ў парадку палітзаняткаў і па-за-школьнае работы. Ні аднае гадзіны, ні аднае хвіліны — за кошт баявое падрыхтоўкі. Больш увагі справе баявое падрыхтоўкі. Гэтага патрабуе ўся міжнародная абстаноўка, гэтага патрабуе ўзрастаючая небясьпека вайны імпэрыялістых супроць Савецкага Саюзу. Рэсвваенсавет прапануе палітычнаму кіраўніцтву РАСЧА:

1. Рыхтаваць усю масу чырвонаармейцаў і малодшага нач. складу для актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялістычнае вёскі, у масавым калгасным руху, у ліквідацыі кулака, як клясы. Ужо ў бягучым годзе трэба дабіцца, каб усе 100 проц. чырвонаармейцаў і малодшых камандзіраў сялян, якія звальняюцца з РСЧА, былі ўцягнуты ў калгасы. Гэта задача павінна пранізаць зьмест партыйна - палітычнае работы чырвонаармейцаў і малодшага нач. складу ў радох РСЧА. Адпаведна з гэтым, Палітычнаму кіраўніцтву безадкладна перабудаваць палітычную работу (агітацыю, прапаганду, арт. ... і г. д.).

2. Падрыхтаваць у 1930 годзе з ліку чырвонаармейскага актыву і малодшых камандзіраў 100.000 масавых работнікаў для вёскі, з іх ня менш 75.000 для калгаснае сыстэмы, здольных кіраваць калгасамі, паасобнымі галінамі работы ў іх, абслугоўваць трактары, камбайны, складаныя сельска - гаспадарчыя машыны і быць перадавымі барацьбітамі за перабудову прасьцейшых калгасаў у вышэйшыя формы.

Падрыхтоўку калгасных кадраў праводзіць на працягу апошняга году службы чырвонаармейцаў і малодшага начскладу, за 6-8 месяцаў да іх звальненьня, шляхам арганізацыі ў часьцёх РСЧА спэцыяльных курсаў.

3. Падрыхтоўку ў Чырвонай армеі масавых калгасных кадраў праводзіць у самай цеснай увязцы з адпаведнымі грамадзкімі арганізацыямі. Палітычнаму кіраўніцтву, па ўзгадненьні з Наркамземам СССР, устанавіць пляны падрыхтоўкі кадраў па вайсковых округах. Забясьпячэньне ў часьцёх курсаў па падрыхтоўцы масавых кадраў для вёскі праграмамі, падручнікамі, неабходнаю літаратураю, выкладчыкамі - спэцыялістым сельска - гаспадарчымі машынамі і прыладамі для навуковых мэтаў, матар'яльнымі сродкамі — ускладзецца на адпаведныя дзяржаўныя і гаспадарчыя органы.

4. Падрыхтоўку пачаць не пазьней 15-га лютага, будуючы ўсю працу на падставе шырока разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва за лепшую падрыхтоўку работнікаў для сацыялістычнае перабудовы вёскі. Палітычнаму кіраўніцтву ў тыднёвы тэрмін распрацаваць усе практычныя паказаньні, якія датычацца падрыхтоўкі масавых кадраў у РСЧА і даць паказаньні на месцы.

5. Партыйна - палітычнае кіраўніцтва чырвонаармейскімі масамі на цяперашнім этапе патрабуе, каб увесь начскладведаў ня толькі агульныя пытаньні палітыкі партыі і сацыялістычнага будаўніцтва і выразна ўяўляў новую палітыку партыі на ліквідацыю кулака, як клясы, але таксама ведаў і на практыцы калгасны рух. У сувязі з гэтым Палітычнаму кіраўніцтву распрацаваць мерапрыемствы па вывучэньні начскладам асноўных пытаньняў тэорыі і практыкі калгаснага руху і з будучага году ўключыць у навучальныя пляны ўсіх вайсковых школ, акадэмій і курсаў мінімум дысцыплін па пытаньнях калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.

6. У сувязі з масавым разгортваньнем суцэльнае калектывізацыі, працу па арганізацыі чырвонаармейскіх калгасаў абмежаваць стварэньнем чырвонаармейскіх груп для будаўніцтва буйных калгасаў толькі на перасяленцкіх землях Далёкага Ўсходу, Казакстану, у суадносінах з плянамі Наркамзему СССР і матар'яльна - тэхнічнымі сродкамі, якія адпускаюцца на гэтыя патрэбы адпаведнымі ўрадавымі і гаспадарчымі арганізацыямі. Арганізацыю чырвонаармейскіх калгасаў на перасяленцкіх землях забясьпечыць палітычным і арганізацыйным кіраўніцтвам, уцягваючы ў гэтыя калгасы дэмабілізуючыхся начскладзіраў і палітработнікаў.

Рэсвваенсавет Саюзу выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што ўвесь начальніцкі склад і паліторганы з усёй энэргіяй возьмуцца за гэту важнейшую справу і дадуць у 1930 годзе краю 100 тысяч баявых арганізатараў сацыялістычнае вёскі.

СТАРШЫНЯ РЭСВВАЕНСАВЕТУ СССР ВАРАШЫЛАЎ.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Беднота і батрацтва ліквідуюць кулакоў

ЦЬВЕР, 29. Куставыя канфэрэнцыі беднаты і батрацтва, якія зараз адбыліся, аднадушна ўхвалілі лінію партыі па ліквідацыі кулацтва, як клясы, і просяць урад выдаць закон аб высяленьні кулакоў за межы раёнаў, канфіскацыі іх маемасьці і перадачы яе ў калгасы.

Зараз з раду раёнаў ужо паступаюць весткі, што лінія партыі на зьнішчэньне кулака, як клясы, праводзіцца ў жыцьцё. На пасяджэньні савету буйнога калгасу «Бальшавік», Селішча-Хвашчынскага раёну, пастаноўлена выселіць з раёну 13 кулакоў - эксплёататараў.

Аналёгічная пастанова аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, ухвалена рабочаю-сялянскім зьездам па пытаньнях суцэльнае калектывізацыі Севастопальскага раёну.

ВЫКРЫТЫ НОВЫЯ НАДЗВЫЧАЙ БАГАТЫЯ ПАКЛАДЫ КАМЕННАГА ВУГАЛЮ

АЛМААТА, 30. На Сбараладзеўскіх гарах (Сыр-Дар'інскае акругі) знойдзены на плошчы даўжынёю ў 120 кілёмэтраў надзвычай багатыя паклады каменнага вугалю. Мясцамі ёсьць выхады вугалю на паверхню зямлі.

Нямецкая беднота і сераднякі даюць адпор буржуазнай правакацыі

СІМФАРОПАЛЬ, 28. Зьезд нямецкага беспартыйнага бядняцка-серадняцкага актыву Джанфойскага раёну, у колькасьці 90 дэлегатаў, зьвярнуўся да нямецкага працоўнага сялянства Крыму з адозваю, у якой рашуча асуджае эміграцыйны рух, як рух контр-рэвалюцыйны, накіраваны кулацтвам і духавенствам супроць сацыялістычнага будаўніцтва. «Мы стаім за будаўніцтва калгасаў, ліквідацыю кулацтва, як клясы, за новую савецкую вёску,—заначаецца ў адозьве. Мы лічым зусім правільнаю палітыку партыі ў галіне сельскае гаспадаркі. Толькі праз калектыўнае земляробства, магчыма выкананьць задачу карэннае перабудовы адсталае, распыленае сялянскае гаспадаркі».

ЛІТАРАТУРНЫ ФОНД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

БАКУ, 30. Паводле ініцыятывы мясцовых газэтных работнікаў, арганізуецца літаратурны фонд калектывізацыі. Мэта гэтага фонду—арганізацыя і пасылка газэт і літаратуры ў калгасы. Ен арганізуецца шляхам адлічэньня 5 проц. гаданорару літаратурных і газэтных работнікаў.

Жорсткія барыкадныя баі ў Бамбэі

Рабочыя абязброілі вайсковыя часьці

Чырвоны сьцяг з сярпом і молатам на масавым мітынгу

БЭРЛІН, 28. «Ротэ Фана» падае падрабязнасьці рэвалюцыйных выступленняў, якія адбываліся ў Індыі ў «Дзень незалежнасьці»—26-га студзеня.

На масавым мітынгу ў Бамбэі атрад рабочае самаабароны, які складаўся з 300 тэкстыльшчыкаў, захапіў трыбуну, сарваў індыйскі нацыянальны сьцяг і ўзьняў чырвоны сьцяг з сярпом і молатам. Кіраўнік атраду, спатканы бурнымі воплескамі, выступіў з гарачаю абвінавальнаю прамоваю супроць тэрору брытанскага імпэрыялізму і супроць здрадніцтва індыйскае буржуазіі інтарэсам працоўных мас Індыі. Былі выкліканы вайсковыя атрады, якія адкрылі па дэманстрантах агонь з кулямётаў. Пачаліся жорсткія баі, якія працягваліся да глыбокае ночы. Атрадам рабочай самаабароны, колькасьцю каля 2.000 чалавек, удалося у многіх мясцох даць адпор вайсковым часьцям, а нават сям-там абязброіць іх. У радзе рабочых кварталаў былі пабудаваны барыкады.

Рэвалюцыйны ўздым сярод індыйскага сялянства

БЭРЛІН, 29. Толькі зараз атрыманы весткі, што ў калцы сьнежня ў Лагоры адбылася масавая канфэрэнцыя рабочых і сялянскіх мас Пэнджабскае правінцыі, у якой прымалі ўдзел 25.000 чалавек, пераважна сялян.

Старшынёю канфэрэнцыі быў абраны Ранадыў, які засуджаны Бамбэйскім судом на 1 год суровага турэмнага зьняволеньня. Калі на канфэрэнцыі паведамілі аб прысудзе Ранадыва, усе дэлегаты ўсклікнулі: «Няхай жыве рэвалюцыя», «Прэч імпэрыялізм».

З прычыны адсутнасьці Ранадыва, другім старшынёю канфэрэнцыі быў абраны селянін Сынгх. Апрануты ў рваную сялянскую вопратку, ён адчыніў канфэрэнцыю наступнымі словамі:

— Я—прытнечаны селянін і не атрымаў асьветы. Урад дбае толькі аб тым, каб выцягнуць з нас падаткі і нічога не зрабіў для ліквідацыі мас няпісьменнасьці. Таму мой зварот да вас, прачытае другі таварыш.

У прачытанай прамове была дана крытыка імпэрыялізму і індыйскага нацыянал - рэфармізму, у прыватнасьці дзейнасьці ўсеіндыйскага кангрэсу. Канфэрэнцыя адбылася з выключнымі рэвалюцыйнымі ўздымам. «Індыйскі ўрад, —заявіў Сынгха, — абвінавачвае сялянскі рух у бальшавізьме. Калі патрабаваньне поўнае незалежнасьці азначае бальшавізм, дык мы сапраўды ўсе бальшавікі».

У рэзалюцыі па пытаньні аб вайсковай небясьпецы канфэрэнцыя заклікае ўсё працоўнае насельніцтва Індыі не даваць для вайны ні грошай, ні людзей імпэрыялістычнаму ураду.

У другой рэзалюцыі канфэрэнцыя заяўляе, што зямля належыць усім, хто яе апрацоўвае.

Гападоўкі палітвязьняў у Румыніі

ВЕНА, 29. Арыштаваныя, у сувязі з апошнімі дэманстрацыямі беспрацоўных у Томашвары, былы старшыня рады ўнітарных прафсаюзаў, тры дзеячы ўнітарных прафсаюзаў і адна камуністка, ужо 6-ты дзень галадуюць у знак пратэсту супроць бесчалавечага турэмнага рэжыму. Атрыманы весткі, што ... шпіцаньні ў Кішыневе дэманстрацыі таксама абвясьцілі галадоўку.

Адрасы ... рублёў. ... год дармова, другі год—75 кап. за кв. саж., трэці—рубель за кв. саж. У доме № 9 жыве ... са сваімі

Найпершая задача вытворчых парт'ячэек

Кожны камуністы павінен на справе паказаць узор ударнага рэвалюцыйнага тэмпу работы

Пабальшавіцку перабудуем партыйную і масавую работу на прадпрыемствах, даб'емся стопроцантнага выканання і перавышэньня кантрольных лічбаў другога году пяцігодкі

ашчаднасьці

Пленум ЦК УсеКП(б) адзначыў, што ва ўмовах агульнае нарадгаспасьці усяго народна-гаспадарчага плану патрэбна вялікая бюджэтна-ашчадная дысцыпліна, мабілізацыя ўсіх рэсурсаў і грашовых зьберажэньняў насельніцтва і жорсткае правядзеньне рэжыму эканоміі.

Асноўнаю прыладаю для зьбіраньня распыленых зьберажэньняў і вольных сродкаў насельніцтва зьяўляюцца дзяржаўныя пазыкі і ашчадныя касы.

Калі ў галіне распаўсюджваньня дзяржаўных пазык, дзякуючы актыўнаму ўдзелу мільёнаў рабочых і сялян, мы дабіліся значных посьпехаў, асабліва ў горадзе, дык у галіне разьвіцьця ашчаднае справы мы наглядаем значную адстапасьць. Ня гледзячы на адносны рост ашчаднае справы за апошнія гады—сума ўкладаў павялічылася з 3.600 тыс. руб. у 26-27 г. да 6.800 руб. у 27-28 г., да 12.200 т. руб. у 28-29., да 15.300 т. руб. на 4-І—30 г.,—да гэтага часу ашчаднымі касамі ахоплена толькі 50 проц. членаў прафсаюзаў, пры чым АСАБЛІВА СЛАБА УЦЯГНУТА ГРУПА РАБОЧЫХ; на вёсцы мы маем зусім нездавальняючы малюнак: ашчадкасамі ахоплена ўсяго 8 проц. агульнага ліку сялянскіх гаспадарак з сумай укладаў у 1.500 тысяч руб.

Кантрольныя лічбы за 29-30 г. выконваюцца нездавальняюча: у першым квартале, паводле заданьня ўраду, павінна быць выканана 40 проц. гадавых кантрольных лічбаў, выканана-ж толькі 22 проц.

Між тым, як у горадзе, так і на вёсцы ёсьць аб'ектыўныя магчымасьці для пасьпяховага разгортваньня ашчаднае справы.

Месячнік ашчаднасьці, які будзе праводзіцца, як шырокая палітычная кампанія, з актыўным удзелам сялянскае грамадзкасьці, мае асноўнай задачай узмацненьне прыцёку вольных сродкаў працоўных на патрэбы індустрыялізацыі краю.

У часе месячніку трэба сравесьці шырокую растлумачальную работу сярод працоўных аб значэньні і неабходнасьці матар'яльнага ўдзелу кожнага рабочага, батрака, бедняка і сярэдняка ў сацыялістычным будаўніцтве.

Разам з гэтым павінны быць шырока папулярызаваны апэрацыі ашчадных кас і іх значэньне ў быце працоўных.

Асноўная база месячніку—калектывы рабочых і служачых у горадзе і аграмаджаны сэктар (саўгасы, калгасы, камуны)—на вёсцы.

Каб расьпяхова правесьці месячнік трэба шырока разгарнуць работу апарату ашчадных кас і актыўнасьць савецкае грамадзкасьці.

Амаблівае месца пры гэтым належыць камісіям дапамогі дзяржкрэдыту пры паасобных прадпрыемствах і установах. Дасюль гэтыя камісіі наогул вельмі слаба працавалі, а ашчаднай справай зусім не займаліся.

Вельмі важным зьяўляецца актыўны ўдзел у месячніку прафсыянальных арганізацый.

Месячнік павінен даць па БССР 3 млн. р. новых укладаў. Для кожнай акругі ўрадам устаноўлена пэўная кантрольная лічба. Трэба кантрольнае заданьне на месячніку, а таксама і плян правядзеньня яго давесьці да кожнага прадпрыемства, установы і сельсавету.

Належнае кіраўніцтва кампаніяй з боку мясцовых партыйных, савецкіх і прафсыянальных органаў і актыўны ўдзел савецкае грамадзкасьці павінны забясьпечыць посьпех гэтае важнае кампаніі.

Да другога Ўсесаюзнага зьезду Асоавіяхіму

Павысім тэмпы, перабудуем рады

Другі Ўсесаюзны зьезд Асоавіяхіму зьбіраецца 10 лютага ў абстаноўцы, калі ў наяўнасьці рэзкае абвастраньне клясавай барацьбы ва ўсіх капіталістычных краінах, калі пагроза новых войнаў і непасрэднага нападу на Савецкі Саюз робіцца ўсё больш рэальнай.

Дзякуючы цьвёрдай і вытрыманай палітыцы міру савецкае дзяржавы, спробы сусьветнага імпэрыялізму ўцягнуць нас у вайну на Далёкім Усходзе сарваліся. Заключэньне згоды з кітайскім урадам азначае сабою вялікую перамогу пралетарскае дзяржавы над капіталістычным сьветам. Ваяўнічы імпэрыялізм пацярпеў поўнае паражэньне. Гэты наш посьпех, аднак, не азначае, што небясьпека вайны не пагражае нам. Мы павінны быць на варце, узмацніць нашу абароназдольнасьць.

Мы маем вялікія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне і шпаркія тэмпыажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну вялікіх работ, вялізарныя дасягненьні ў галіне рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і яе калектывізацыі.

На шляху ажыцьцяўленьня нашых плянаў мы спаткаем яшчэ шмат труднасьцяй, шмат перашкод. Гарантыя нашых перамог — удзел найшырэйшых мас у справе абароны, у справе сацыялістычнае рэканструкцыі. У выкананьні гэтай задачы Асоавіяхім адыгрывае вялікую ролю.

Асоавіяхім у цяперашні час сапраўды зрабіўся масавай добраахвотнай шматмільённай арганізацыяй.

Задачы сацыялістычнае рэканструкцыі патрабуюць карэннага пералому ў тэмпах, арганізацыйных формах, мэтадах работы і ад нашага таварыства.

Савецкая грамадзкасьць, адным з перадавых атрадаў якое зьяўляецца Асоавіяхім, павінна ўзяць самы актыўны і самы непасрэдны ўдзел у наступнай рэалізацыі пяцігадовага пляну сацыялістычнага будаўніцтва і абароны. Перад новымі вялікімі задачамі трэба забясьпечыць выразнасьць і плянавасьць ва ўсёй сыстэме работы Асоавіяхіму, даць павышаныя тэмпы росту ва ўсіх галінах, забясьпечыць дысцыпліну, узьнясьці узровень кадраў у адпаведнасьці з патрабаваньнямі нашай вялікай эпохі.

Наша задача — працягваць работу на галоўнейшых стыжнёвых напрамках, вызначаных радам пастаноў таварыства на працягу ўсяго пэрыяду. У той-жа час, паколькі ўся наша работа ў значнай сваёй частцы накіравана на перагаданьне вузкіх месц, мы павінны зрабіць у сваёй практычнай рабоце ў межах асноўных задач таварыства ўпор на трох асноўных пунктах па гэтых вузкіх напрамках: папершае, падрыхтоўка людзкіх рэсэрваў у цеснай сувязі і ў далятак работы НКВ, падругое, праблема мэханізацыі абароны, патрэбе, хэмізацыя краіны.

Лёзунг сацыялістычнага спаборніцтва павінен стаць вагаром перабудовы мэтадаў, арганізацыйных форм і павышэньня тэмпаў нашай работы.

Сацыялістычнае спаборніцтва пакуль яшчэ невыстарчальна разгарнулася ў радах асоавіяхімаўскіх арганізацый. Зьезд павінен стварыць карэнны пералом у гэтых адносінах.

Слаба разьвіваецца пакуль што ў нас і самакрытыка. Трэба зразумець, што толькі праз самакрытыку, праз самаправерку мы знойдзем шлях да зьніжэньня недахватаў. Зброю самакрытыкі трэба ўдарыць па адсталых вучастках нашай работы, па ўсіх недахватах, выпадках бюракратычных адносін да задач, якія стаяць перад намі і г. д.

Змясьцівае ажыцьцяўленьне гэтых задач, перабудова на новай базе работы нашага таварыства ўпіраецца ў вялікай дачнае асобы. Ар... свае назвай.

лагадоўлі і павышэньня яе таварнасьці, арганізуе кармавую базу шляхам увядзеньня адпаведных севазваротаў (тра... меры ў стан асоавіяхімаўскай работы на вёсцы. Цяпер, калі сацыялістычная рэканструкцыя шырока ахапила сельскую гаспадарку, калі вёска перажывае пэрыяд карэннага пералому. Асоавіяхім павінен максымальна разгарнуць работу на вёсцы.

Зусім невыстарчальная работа Асоавіяхіму сярод жанчын. А, між тым, з радоў работніц, а часткова ўжо і сялянак, вышла ня мала актывістак нашага таварыства, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у будаўніцтве абароны.

Усё большую ўвагу мы ў нашай рабоце павінны зьвярнуць на моладзь, рыхтуючы кадры новых будаўнікоў, кадры байцоў, кадры Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Мы павінны шырэй ахапіць сваёй работай рады савецкай інтэлігенцыі.

У сувязі з абвастраньнем клясавай барацьбы і наяўнасьцю правааапартуністычных праяўленьняў у практыцы работы Асоавіяхіму мы павінны даць самы рэзкі адпор усім спробам супрацьленьня або скажэньня клясавай лініі з боку клясавага ворага і апартуністычных элемэнтаў.

Гарантыяй пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтых задач зьяўляецца ленінскае кіраўніцтва нашай партыі, цесная сувязь з камсамолам і прафсаюзамі, шырокае ўцягненьне ўсёй сацыялістычнай грамадзкасьці ў работу Асоавіяхіму.

І. УНШЛІХТ.

Упарта і настойліва змагацца за перавыкананьне прамфінпляну

Недавыкананьне кантольных лічбаў у першым квартале 4 радзе заводаў і фабрык з усёй вырасьнасьцю сьведчыць аб тым, што асобны вытворчыя партка-лектывы аслабілі увагу да гаспадарчага кіраўніцтва прадпрыемстваў. Свае рэзалюцыі аб паскарэньні тэмпаў выкананьня прамфінпляну частка партарганізацый не ўмацавала канкрэтнай і практычнай работай. Матар'ялы, якія сёньня зьмяшчаюцца ў «Зьвязьдзе», сыгналізуюць аб тым, што асобныя вытворчыя партарганізацыі ганебна адстаюць у барацьбе за паскарэньне тэмпаў гаспадарчае работы фактычна спаўзло на рэйкі апартуністычнай капітулянцкай практыкі.

Практыка парткіраўніцтва заводу «Чырвоны Мэталісты» зьяўляецца лепшым прыкладам у гэтым напрамку. Захопленае зьнянацку бурнымі тэмпамі работы і ўзросшай актыўнасьцю рабочай масы, парткіраўніцтва заводу спасавала перад труднасьцямі і ня здолела стаць на чале гэтай актыўнасьці. У выніку мы сталі перад фактам пагрэбнасьці датэрмінова перавыбраць усе бюро цэхавых ячэек КП(б)Б заводзкай арганізацыі таму, што яны зусім ня здолелі перабудаваць партработу ў цэхах у адпаведнасьці з новымі задачамі і стаць на чале сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарнага руху.

Як паказала чыстка буйней цэхавай ячэйкі фабрыкі «Гэрой Працы», парткіраўніцтва вытворчага цэху зусім стаяла ў баку ад гаспадарчых пытаньняў. Вытворчы цэх, які зьяўляецца асноўным цэхам фабрыкі «Гэрой Працы», у першым квартале ня выканаў асноўных вытворчых паказальнікаў. Сабекошт прадукцыі зьніжаны толькі на 5 проц. замест 12. прадугледжаных прамфінпляном. Прадукцыйнасьць працы, замест 50 проц., вызначаных у прамфінпляне, павялічана толькі на 32 проц. Партыйныя і прафсаюзныя кіраўнікі вытворчага цэху тлумачаць гэтыя прарывы «аб'ектыўнымі» прычынамі. Аднак, пры самым паверхоўным азнаямленьні са станам партыйнай і прафработы ў цэху становіцца зусім ясным уся бесталкоўнасьць гэтых «аб'ектыўных» прычын. Выяўляецца, што ў першым квартале ячэйка, ня гледзячы на штомесячнае невыкананьне кантрольных лічбаў, ні аднаго разу не паставіла пытаньня аб прамфінпляне.

Яшчэ да гэтага часу далёка ня ўсе партыйцы і камсамольцы зьяўляюцца ўдарнікамі сацыялістычнага спаборніцтва.

Сыгналы з „Чырвонай Бярэзіны"

Новыя прарывы на вытворчым фронце

Бязьдзейнасьць фабрычнага парткіраўніцтва

Марудныя тэмпы работы замест баявой мабілізацыі

«Зьвязда» ў свой час сыгналізавала аб вытворчых прарывах на фабрыцы «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА». Прамфінплян за першы квартал на фабрыцы недавыкананы. Партарганізацыя першы час узялася за выпраўленьне прарываў на гаспадарчым фронце. Рабочыя пачалі калектыўна ўступаць у сацыялістычнае спаборніцтва. Аднак, цэны рад фактаў выразна сьведчаць аб тым, што яшчэ на гэтым фронце зроблена зусім мала. Партарганізацыя яшчэ зусім не дабілася нізкага пералому ў барацьбе за поўнае выкананьне прамфінпляну. Энтузіязм, з якім узялася партарганізацыя за выпраўленьне прарываў, хутка зьнік. Работа зноў ідзе старымі тэмпамі. Гэта стварыла глебу для новых гаспадарчых прарываў.

За апошні час на фабрыцы рэзка пагоршылася працоўная дысцыпліна. Мае месца рад выпадкаў няўважлівых адносін з боку рабочых да машын і варштатаў. За апошні час на работу прынята звыш 500 чалавек. Здаецца, што партарганізацыя павінна была разгарнуць масавую агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод новых рабочых, якія ў сваёй асноўнай масе ўпяршыню прышлі на вытворчасьць. Партарганізацыя ў гэтым напрамку нічога ня робіць. Палітычнае выхаваньне новай масы рабочых зусім заняпала. Фабрычны камітэт і цэхпрафбюро адарваліся ад рабочае масы і амаль не заглядваюць у цэхі і аддзяленьні. Бюро парткалектыву, замест таго, каб абудзіць фракцыю прафорганаў, не рэагуе на фактычны заняпад і зрыў прафсыянальнай работы на вытворчасьці. Бюро патрыкалектыву і фабкам паранейшаму «ўвязваюць» і «ўзгадняюць» пытаньні, а між тым, на заводзе маюць месца факты, якія прымушаюць нас біць паўторную трывогу.

На «Чырвонай Бярэзіне» з кожным днём пагражаюча растуць прагулы. Колькасьць прагулаў па нягрунтоўных прычынах бязупынна павялічваецца. Калі ў першым квартале на фабрыцы было 1-2 прагулы ў дзень, то зараз лік прагулаў дасягае 8-12 кожны дзень.

За апошнія дні на фабрыцы былі выпадкі, якія мяжуюцца са шкодніцтвам. У цэхах і аддзяленьнях частка рабочых недапушчальна адносіцца да варштатаў. У ШЧАПАЛЬНЫМ цэху з-за нядбайнасьці групы рабочых зламаны два нажы. У АЎТАМАТНЫМ цэху таксама здараюцца паломкі з-за нядбайных адносін да машын, што выклікае вялікія рамонты. У стругальным аддзяленьні ў кола машыны са шкодніцкай мэтай быў укінуты кавалак жалеза. У выніку машына выбыла са строю на 3-4 месяцы.

Ці мабілізавала бюро парткалектыву камуністых і беспартыйных рабочых і работніц на барацьбу са шкодніцтвам за ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны. Ці паставіла парткіраўніцтва рубам пытаньне аб недапушчальнай бязьдзейнасьці прафсаюзных органаў на прадпрыемстве, якія ня прымаюць ніякага ўдзелу ў вытворчым жыцьці фабрыкі. З усёй рашучасьцю трэба сказаць, што парткіраўніцтва «Чырвонай Бярэзіны» гэтага НЕ ЗРАБІЛА. Цэхавыя парт'ячэйкі не рэагуюць на хвасьцісцкія паводзіны асобных камуністых і ня прыцягваюць да партыйнай адказнасьці тых партыйцаў, якія плятуцца ў хвасьце, зрываюць выкананьне прамфінпляну, парушаюць працоўную дысцыпліну і ня прымаюць удзелу ў сацыялістычным спаборніцтве.

Камуністы ТОПЭР зьяўляецца злосным прагульшчыкам і амаль кожны дзень позьніцца на работу. Аднак, парт'ячэйка да гэтага часу не зрабіла ніякіх аргвыводаў у адносінах да прагульшчыка Топэра.

Фабрычныя камсамольцы таксама яшчэ ня сталі ініцыятарамі і арганізатарамі сацыялістычнага спаборніцтва. Частка камсамольцаў займае ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну яўна хвасьцісцкую лінію. Група сьлесараў-камуністых на працягу доўгага часу сыстэматычна займалася рэацтвам.

Здаецца, што парткіраўніцтва фабрыкі павінна было завастрыць увагу арганізацыі на гэтых недапушчальных правалах, хаця-б у часе чысткі, якая зараз адбываецца. Здаецца, што на чысткі павінна быць рубам паставлена пытаньне аб удзеле камуністых у сацыялістычным спаборніцтве і барацьбе за выкананьне прамфінпляну. Аднак, абстаноўка, у якой адбываецца чыстка, дае нам поўныя падставы заявіць, што на фабрыцы па сутнасьці праверка і чыстка парткалектыву зрываецца. На праверачных сходах у сярэднім прысутнічае ня больш 250 чалавек, і гэта ў той час, калі на фабрыцы працуе 1.700 рабочых і работніц.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» далёка ня ўсё добра. Патрэбны бездакладныя рашучыя і энэргічныя меры.

М. Н.

Стаўка на „самацёк" Хвасьцісцкая лінія бюро ячэйкі

(Мазыр. завод „Пралетары")

Асноўная маса рабочых заводу «Пралетары» (Мазыр) вядзе ўпартую барацьбу за поўнае выкананьне прамфінпляну.

Зараз на заводзе налічваецца 16 ударных брыгад. Вынікі работы ўдарнікаў відавочныя. У першым квартале завод поўнасьцю выканаў плянавае заданьне па зьніжэньні сабекошту і павялічэньні прадукцыйнасьці працы. Па ініцыятыве ўдарніка тав. Табола, на заводзе разгортваецца спаборніцтва паміж асобнымі рабочымі. Многія майстры падалі заявы аб зьніжэньні расцэнак і павышэньні норм выпрацоўкі.

Аднак, сацыялістычнае спаборніцтва праходзіць без усялякага кіраўніцтва з боку партыйнай ячэйкі. Ячэйка ў сваёй асноўнай масе, за выключэньнем асобных камуністых—удзельнікаў ударных брыгад—ня прымае ніякага ўдзелу ў сацыялістычным спаборніцтве. Камсамольская ячэйка таксама стаіць у баку ад спаборніцтва. Гэта зьяўляецца выключным фактам хвасьцізму і бюракратычных адносін да важнейшай палітычнай задачы. Кіраўніцтва ячэйкі не паставіла рубам пытаньня аб 100-процантным удзеле камуністых і камсамольцаў ва ўдарных брыгадах. Сярод членаў 16-ці ўдарных брыгад ёсьць толькі 4 партыйны і 4 камсамольцы. Асобныя партыйцы адкрыта выступаюць супроць павялічэньня прадукцыйнасьці працы. І гэта ў той час, калі беспартыйныя рабочыя дораахвотна зьніжаюць расцэнкі і патрабуюць поўнай нагрузкі.

Проста кажучы партыйнае кіраўніцтва заводу зусім не займалася пытаньнем аб сацыялістычным спаборніцтве і ўдарным руху і не змагалася з хвасьцісцкімі недапушчальнымі адносінамі часткі партыйцаў да вытворчасьці. Пры чыстцы ячэйкі праверком паказаў на гэты сур'ёзнейшы прарыў і прапанаваў безадкладна яго выправіць. Здаецца, што пасьля чысткі ячэйка павінна была рашуча павярнуцца тварам да вытворчасьці і стаць на чале сацыялістычнага спаборніцтва. Аднак, ячэйка не ажыцьцяўляе пастаноў праверачнай камісіі і паранейшаму пляцецца ў хвасьце мас, ня кіруючы спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі. На заводзе сацыялістычнае спаборніцтва паранейшаму разгортваецца самацёкам без усялякага ўдзелу партыйнай ячэйкі. З гэтага выключнага факту трэба зрабіць поўныя вывады. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай лініі кіраўніцтва ячэйкі ў пытаньнях сацыялістычнага спаборніцтва. Ячэйка павінна быць аздароўлена.

Б. Ш.

дамоў рэлігійных культаў марыяюцца ў канцылярыях НКУС

Друк наш за апошні час стракаціць весткамі аб закрыцьці царквоў, сынагог і іншых малітвеных будынкаў. Працоўныя, па сваёй ініцыятыве, ставяць пытаньне аб закрыцьці будынкаў рэлігійных культаў і перадачы іх пад культурныя патрэбы. У калгасах і саўгасах ідзе карэнная ломка быту.

На жаль, цэнтральная камісія па аддзяленьні царквы ад дзяржавы і НКУС вельмі няўважліва адносяцца да запатрабаваньняў працоўных, да вялікага антырэлігійнага руху, які ахапіў самыя далёкія куткі БССР.

Камісія марыную месяцамі пастановы аб закрыцьці царквоў і сынагог і не дае адказу на безьліч запытаньняў месц.

Вось невялічкая даведка, толькі аднаго Мазырскага адмаддзелу, якая сьведчыць аб фармальным, бюракратычным падыходзе да вырашэньня такога важнага пытаньня з боку НКУС і яго цэнтральнай камісіі.

«Пачынаючы з 13/VIII 29 г., Мазырскай акруговай камісіяй па аддзяленьні царквы ад дзяржавы накіраваны ў цэнтральную камісію нізкаўзрэлічаныя пратаколы з пастановамі аб перадачы будынкаў рэлігійных культаў пад розныя культурныя ўстановы: пратакол № 7 ад 13/VIII 29 г. аб дазволе разбурэньня капліцы ў б. маёнтку «Бакунеткі», № 10 ад 9/X 29 г. аб закрыцьці Пухавіцкай царквы; пратакол ад 17/X 29 г. аб закрыцьці Маляшоўскай царквы і Тураўска-Кайданацкай сынагогі; ад 1/XI 29 г. аб закрыцьці Капацкевіцкай і Сіменавіцкай сынагог; ад 22/XI 29 г. аб закрыцьці Калінкавіцкай, Альмінаўскай і Падгорнай сынагог; ад 27/XI 29 г. аб закрыцьці Ламанавіцкай, Качышчанскай і Лельчыцкай цэркваў і сынагог; пастанова ад 6/XII 29 г. аб закрыцьці Нараўлянскай сынагогі і Бабыніцкай царквы: пастанова ад 17/XII 29 г. аб закрыцьці Сіхавіцкай царквы і Паграбальнай сынагогі.

На ўсе вышэйпаказаныя пастановы аб закрыцьці царквоў і сынагог, адказу і зацьвярджэньня ад цэнтральнай камісіі няма».

Характэрна, што ўсе гэтыя пастановы прыняты аднагалосна.

Вось яшчэ факты: калгасьнікі Даманавіцкага сельсавету (Мазыршчына), сельсавету суцэльнай калектывізацыі аднагалосна пастанавілі забраць царкву пад культурныя патрэбы, а ўсю маемасьць царквы — для клюбу. РВК з гэтым згадзіўся. Адмаддзел згадзіўся папалову, а цэнтральная камісія зусім маўчыць і не адказвае на гэтае пытаньне.

Згадзіўшыся забраць Даманавіцкую царкву пад культурныя патрэбы, Мазырскі адмаддзел піша адносіну Калінкавіцкаму райвыканкому, у якой прапануе царкоўную маемасьць аддаць даманавіцкаму папу Дудкіну, «а што датычыць прылад для хрышчэньня, дык часова іх ад Дудкіна не адбіраць, а абавязаць яго падшыбай перадаць у Мазырскі сабор». Працоўнае сялянства пастанавіла, а адмаддзел ня лічыцца з гэтай пастановай.

Работа цэнтральнай камісіі па аддзяленьні царквы ад дзяржавы адстае ад росту антырэлігійнага руху. Трэба, каб НКУС спыніў марынаваньне пастановаў агульных сходаў працоўных.

М. Ш—т.

ПАСТАНОВА

Гомельскага бюро АК і прэзыдыуму АКК КП(б)Б

1. Заслухаўшы паведамленьне тав. МАЛАКОВІЧА аб парушэньнях самакрытыкі ў радзе пастаноў АКК (справа сьпіртазаводу, гарбарні, рабкораў Маркава, Мяжэньнікава, Крыштафука, Заікі, Гаўрылава і інш.), чэстка якіх (справа сьпіртазаводу і гарбарні) была ўзгоднена з бюро АК, аб'яднанае пасяджэньне бюро АК і прэзыдыуму АКК, ухваляючы пастановы ЦКК КП(б)Б па гэтых пытаньнях, рашуча асуджае гэтыя свае памылкавыя і палітычна-шкодныя пастановы, як факты грубага парушэньня самакрытыкі, якія аб'ектыўна выклікалі ўзмацненьне элемэнтаў заціску самакрытыкі і далі магчымасьць бюракратычным элемэнтам скарыстоўваць некаторыя з гэтых пастаноў, як пагрозу за самакрытыку.

2. Настроі паасобных парт'ячэек, фабзаўкомаў і партадміністратараў прадпрыемстваў і ўстаноў шукаць, галоўным чынам, у заметках рабкораў няправільнае, вышукваць у пісаўшых іх памылкі, капацца ў іх мінулым і г. д., замест таго, каб усю энэргію накіраваць на выкрыцьцё і зьнішчэньне недахопаў, адзначаных у заметках. Такія настроі знайшлі свой адбітак і ў паасобных пастановах прэзыдыуму АКК-РСІ і бюро АК. Гэта здарылася таму, што як прэзыдыум АКК, так і ў сьлед за ім і бюро АК ня крытычна адносіліся да ўсіх выпікаў і прапаноў, вылучаемых прэзыдыумам АКК-РСІ, камісіі па расьследваньні рабкораўскіх заметак, якія (камісіі) у сваёй рабоце, побач з раскрыцьцём тых ці іншых недахопаў у рабоце прадпрыемстваў, аб якіх пісалі рабкоры, і побач з выкрысьненьнем прапаноў аб спагнаньні вінаватым за безгаспадарчасьць і г. д., пад націскам вышэйпамянёных нездаровых антыпартыйных настроіў, займаліся часта непамерным капаньнем і выкрыцьцем тых ці іншых памылак пісаўшых, выносілі прапановы і аб спагнаньні пісаўшым за іх паасобныя памылкі, якія да данае справы ня мелі ніякіх адносін. Прэзыдыум АКК і бюро АК, ня крытычна адносячыся да такіх прапаноў і штампуючы іх, тым самым давалі повад бюракратычным элемэнтам скарыстоўваць такія пастановы супроць самакрытыкі.

3. Асабліва недапушчальным зьяўляецца тое, што пры прахаджэньні судовых спраў рабкораў Мяжэньнікава і Маркава, супроць якіх былі высунуты крымінальныя абвінавачэньні, ні прэзыдыум АКК, ні бюро АК дастаткова на зацікавіліся гэтымі судовымі справамі і ня прынялі своечасова адпаведных мер да правідловага іх вырашэньня.

4. Бюро АК і прэзыдыум АКК прызнаюць сваю грубую памылку ў тым, што своечасова не рэагавалі на няправільнае выступленьне т. Мапаковіча на мінулым пленуме (лістапад 1929 г.) АК, на якім няправільна было высунута абвінавачаньне ў «левым загібе» ячэйкі чыгуначнага палка за тое, што гэта ячэйка вынесла рэзкую пастанову супроць Нова-Беліцкага райкому, у зьвязку з праваапартуністычнай памылкай, дапушчанай РК у сваёй працы (справа каніфольнага заводу). Бюро АК і прэзыдыум АККцалкам і поўнасьцю згаджаюцца з ацэнкаю, данай па гэтым фанце прэзыдыумам ЦКК.

5. Акругком і АКК КП(б)Б завастраве ўвагу ўсёй Гомельскай партарганізацыі на грубыя парушэньні самакрытыкі ў паасобных пастановах прэзыдыуму АКК і бюро АК, выкрытых ЦКК КП(б)Б, зварочваецца з заклікам да ўсёй партарганізацыі шырэй разгарнуць самакрытыку, ня гледзячы на асобы, зьверху да нізу і зьнізу да верху, вакол усіх пытаньняў нашай работы і дапамагчы ўсім парторганам акругі зьнішчыць усе іх памылкі па ўсіх галінах іх работы. Акругком і АК КП(б)Б заклікаюць усіх сяброў партыі павесьці самую рашучую і самую бязьлітасную барацьбу з усімі тымі, хто перашкаджае праводзіць у жыцьцё дырэктывы партыі аб самакрытыцы, хто тымі ці іншымі спосабамі і сродкамі прабуе заглушыць самакрытыку, хто ня хоча прыслухоўвацца да голасу мас і хто імкнецца, замест выкрыцьця і зьнішчэньня недахопаў у сваёй рабоце, перанесьці асяродак цяжкасьці на памылкі, выкрываючыя усе недахопы і агіднасьці.

6. АК і АКК прапануюць РК, ячэйкам і ўсім членам партыі падрабязна прапрацаваць усе пастановы ЦКК па памылковых рашэньнях АК і АКК, што зьяўляюцца парушэньнем самакрытыкі, на партыйных сходах і яшчэ раз правярыць у сябе, як праводзяцца дырэктывы партыі аб самакрытыцы, як кіруючыя органы зьнізу да верху рэагуюць на рабкораўскія заметкі, як вядзецца работа з рабкорамі.

7. Акругком і АКК патрабуюць ад усёй партарганізацыі і кожнага члена партыі ў паасобку стаць на чале далейшага, яшчэ больш рашучага разгортваньня самакрытыкі, арганізуючы вакол сябе шырокія рабочыя масы для бязьлітаснай і творчай крытыкі, накіраванай на сапраўдную барацьбу з усялякімі скажэньнямі і недахопамі ў рабоце ўсіх арганізацый і ў сваім уласным асяродзішчы. Усю вастрату самакрытыкі накіруем супроць клясавага ворага і ўсіх яго вылазак. Усю вастрату самакрытыкі накіруем супроць адхіленьняў ад правільнай лініі партыі і, галоўным чынам, супроць правага ўхілу і прымірэнчых адносін да яго, як найбольш небясьпечных на даным этапе, не паспаляючы барацьбы з «левым загібам». На падставе шырока разгорнутай самакрытыкі і шырокай масавай працы разгорнем нябачаныя тэмпы ў сваёй рабоце для пасьпяховага выкананьня вытворчых праграм на прадпрыемствах, правядзеньня з посьпехам веснавое пасяўнае кампаніі, яшчэ большага павялічэньня тэмпаў калектывізацыі сельскае гаспадаркі і тым самым у найбольш кароткі тэрмін зьнішчыць кулацтва, як клясу, рашуча і канчаткова зламаць супраціўленьне нашых клясавых ворагаў — кулака і нэпмана і падняць яшчэ большую актыўнасьць найшырэйшых колаў рабочае клясы і працоўнага сялянства на выкананьне ўсіх мерапрыемстваў па сацыялістычным будаўніцтве ў нашым краі.

Новая вылазка клясавага ворага ў „навукова-дасьледчай" працы

Ніжэй мы падаем вытрымкі з кніжкі «Матар'ялы экспэдыцыі па вывучэньні буйной рагатай жывёлы сялянскіх гаспадарак Менскай і Віцебскай акруг БССР 1928 г.». Аўтарамі гэтай кніжкі зьяўляюцца: праф. М. М. Пелехава (ч. 1) і Б. М. Сьвіршчэўскі (ч. II). Выдана гэта кніжка ў 1929 г. аддзелам жывёлагадоўлі і прыкладнае заалёгіі Беларускага навукова-дасьледчага інстытуту імя Леніна.

Вось што гаворыцца на старонках гэтае «працы»:

«Ступень заможнасьці двара выразней за ўсё адбіваецца на імкненьні да малочнай каапэрацыі. Так, у Менскай акрузе са 100 заможных двароў, у малочную каапэрацыю аб'яднаецца амаль у 4 разы большая колькасьць двароў, чым са 100 бядняцкіх двароў; а ў Віцебскай акрузе амаль удвая большая;— у спажывецкіх каапэрацыйных аб'яднаньнях гэта розьніца таксама наглядаецца, але тут яна роўна ўсяго некалькім процантам. Узмацненьне імкненьня гаспадарак заможнай групы да малочнай каапэрацыі, канечна, зусім зразумела, у гэтых гаспадарках больш, чым у іншых, застаюцца малочныя лішкі, якія патрабуюць пераапрацоўкі.

Канчаючы разгляд даных, якія тычацца малочнай каапэрацыі, мы хацелі-б пажадаць, каб у будучым «Белсельсаюз» аддаваў больш колькасьць энэргіі і сродкаў мерапрыемствам агрэпамогі: каапэрацыя зьяўляецца тым сьцёкам, праз які лягчай за ўсё пранікаюць у сялянскую гаспадарку розныя віды палянішэньні, — у каапэрацыю заўсёды першымі ідуць гаспадаркі найбольш багатыя ініцыятывай, альбо капіталам, — натуральна, што такія гаспадаркі больш успрымальны за іншых да ўсякага роду мерапрыемстваў і гэтую іх асабівасьць неабходна скарыстаць агрэнамам. Таму вельмі пажадана, каб асыгнаваньні на мерапрыемствы агрэдапамогі з боку каапэрацыйных арганізацый былі павялічаны — тут сродкі, выдаткаваныя на дапамогу, зьяўляюцца найбольш эфэктыўнымі.

З павялічэньнем заможнасьці гаспадарак павялічваецца і доля ўдзелу гаспадарак у справе гадаваньня маладняка— асабліва пасьлядоўна адзначаная сувязь наглядаецца ў Віцебскай акрузе. У сувязі з тым, што ў гаспадарках заможных ёсьць вялікая колькасьць матыснай скаціны і іх была наогул капітоўней па ўдоі, крайне пажадана, каб ад скаціны заможных гаспадарак па магчымасьці больш захоўвалася цялят для расплоду. У выніку чаго, в пункту гледжаньня народнай гаспадаркі, пажадана было-б палатковай палітыцы даць такі напрамак, каб справе выгадаваньня маладняка ў заможных гаспадарках не рабілася перашкод; — збытак ад папаўненьня маладняка гэтыя гаспадаркі мімавольна павінны будуць у значнай частцы перастуціць менш заможным грунам, што для справы жывёлаводзтва прынясе толькі карысьць» (ст. 61-62).

Для кожнага, нават палітычна малапісьменнага, камэнтары да падобных «вываў» непатрэбны. Гэта голас кулака ў «навуковым» адзеньні.

А вось «ўражаньні» дасьледчыкаў аб савецкай сялянскай гаспадарцы Бягомльскага раёну, Менскай акругі, у 1928 г.:

«Агульнае ўражаньне ад сялянскай гаспадаркі ня надта прыемнае». (Стар. 78).

«Але настрой у нас з першага-ж часу спаў; дзіка працаваць сярод зусім някультурных сялян. Адсюль на цябе глядзяць сурова, бо яны ніколі ня бачылі нічога падобнага, а часам сустракаліся такія мясьціны, дзе агранома і ня бачылі, а што-ж датычыцца да вэтэрынара, то і ня чулі» (стар. 76).

«Умовы накладаюць адбітак на сялян і на іх жыцьцё: цісія, забітыя, маўчуны, нішто іх ня радуе, ня цікавіць. Беднасьць сялян яскрава падкрэсьлівалася ў адной вёсцы, дзе на «спася» ня было ніводнага п'янага, супроць нашага чаканьня. Шмат па вёсках культавых, сьляпых і іншых калек ад прыроды» (стар. 76-77).

Гэта ўжо крыху іншае. Калі ранейшае — голас яўнага кулака, дык гэтую ацэнку становішча сялянства ў 1928 г. у Бягомльскім раёне Савецкай Беларусі з вялікай прыемнасьцю зьмяшаюць па сваіх старонках усякая эміграцыйная чорасотенная газэта або часопіс.

Што-ж датычыць «навуковых» мэтадаў на падставе якіх зроблены такія «вывады», мы іх разьбярэм у другі раз. Яны па сутнасьці такія-ж, як і вывады становішча сялянскай гаспадаркі.

Зараз-жа наша мэта — вылініць парад самай шырокай пралетарскай грамадзкасьцю новую вылазку на ідэалёгічным фронце клясавага ворага.

К. ЗАГОРСКІ.

З жыцьця АДУЧ армії

ЗА АРКАЙ МЯЖЫ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

VII.

Ноччу журналісты варочаецца на вакзал. На першай пляцформе цягнік. І там яму далікатна адводзіцца купэ. Прыгожы вагаэл бліскуча асьвечлены агнямі, на пляцформе аўтамабілі вышэйшага камскладу, ля вагонаў бясшумна ходзяць вартавыя, цішыня і толькі ў суседнім купэ сухо цюкае ключ тэлеграфістага і тэлефаністы паролем выклікае часьці.

— Парыж? Алё Парыж! Слухай!.. Камандзіру заўтра выехаць з Парыжу, Джэньне... Прыняў? Алё, алё! Парыж!.

Чутно, як тэлеграфісты шурхацяць лісткамі тэлефанаграм, ён будзе ўсю ноч пад стук ключа перадаваць дакладныя паведам

рацы

Брыгады разгарнулі работу

Заводская грамадзкасьць яшчэ ня ўцягнута ў агляд

Члены цэнтральнае брыгады па аглядзе рабочае каапэрацыі, сумесна з супрацоўнікам «Зьвязды», правялі абсьледваньне ўсіх ЦП па пытаньні, як працуюць брыгады па аглядзе каапэрацыі.

Трэба адзначыць, што за апошнія дні работа брыгад значна разгарнулася. Па саюзе хэмікаў у аглядзе прымаюць удзел завод «Пралетары», фармзавод і «Чырвоны Хэмік». Брыгады ўжо разгарнулі сваю работу, і ўчора ЦП саюзу паставіла даклад старшыні заўкомаў аб тым, як праходзіць работа брыгад.

У тэкстыльшчыкаў працуюць брыгады лямпавае фабрыкі, вяровачнай і фабрыкі «Чырвоны Тэкстыльшчык».

Па саюзе дрэваапрацоўшчыкаў працуюць брыгады галянтарэйнае фабрыкі «Беларуска» і заводу «Дрэваапрацоўшчык», якія ўжо канчаюць свае абсьледваньні. Трэба адзначыць, што дрэваапрацоўшчыкі ўцягнулі ў агляд жонак рабочых і добраахвотнікаў.

Харчавікі вылучылі брыгады з рабочых фабрыкі цукерак. «Пралетары» і бойні, якія ўжо канчаюць сваю работу. Горш стаіць справа з хлебазаводам і фабрыкай «Беларусь», якія да агляду яшчэ не прыступілі.

Гарбары, мэтапістыя і транспартнікі таксама разгарнулі за апошнія дні сваю работу.

Яшчэ раз трэба адзначыць, што агляд рабочае каапэрацыі праводзіцца далёка ня так, як гэта было-б патрэбна. Амаль на ўсіх прадпрыемствах агляд каапэрацыі праводзіцца выключна вылучанымі рабочымі брыгадамі. Шырокія рабочыя масы, жонкі рабочых, заводзкі актыў у агляд яшчэ ня ўцягнуты.

Насьценгазэты вельмі слаба асьвятляюць агляд рабочай каапэрацыі. Трэба на старонках насьценгазэт больш адвесьці месца артыкулам і прапановам рабочых, зьвязаным з аглядам каапэрацыі. На прадпрыемствах, у сталоўках, у рабочых пасёлках трэба вывесіць лёзунгі, якія заклікалі-б да ўдзелу ў аглядзе рабочае каапэрацыі.

Вынікі работы брыгад павінны быць абвешчаны на шырокіх рабочых сходах і ў насьценных газэтах.

ЦП саюзаў павінны прасачыць за тым, каб работа брыгад была кончана ў найбольш кароткі тэрмін.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ У САЎГАСЕ „ЛОШЫЦА"

Каровы па калена ў гразі.— Машыны папсаваны і не рамантуюцца

Нядаўна група рабочых, якія вылучаны для работы ў калгасах, наведала саўгас «Лошыца», у 4-х клм. ад Менску. Лектары гаварылі вылучэнцам, што гэты саўгас каля Менску ьяўляецца адным з лепшых. На вялікі жаль, яны прымушаны былі ў гэтым расчаравацца.

У саўгасе ім прышлося сустрэцца з агідпейшымі зьявішчамі. У саўгасе шмат складаных сельска-гаспадарчых машын, але яны скінуты ў адну кучу і знаходзяцца ў такім выглядзе, што нават нельга пазнаць, што гэта за машыны. Дыскавая барана стаіць уся ў гразі, відаць, што не прывезьлі з поля і тут пакінулі. Жнявярка-вязалка заржавела, вязальнага мэханізму ўжо няма. У суседнім хляве скінуты, таксама ў адну кучу, больш дробныя с.-г. машыны, як бульбакапалка, сакаўскія плугі, бораны і г. д. Машыны знаходзяцца ў вельмі безгаспадарчым стане.

У хлявох таксама панае безгаспадарчасьць: каровы стаяць па калена ў гразі. Сена валяецца і топчацца. Дацкіх кармушак ёсьць толькі дзьве і то, яны разламаны.

У галіне падрыхтоўкі да веснавое сяўбы у саўгасе амаль нічога ня зроблена.

Рабочыя: Кавалёў, Пугачоў, Мэкакзр, Усаў, Бураў.

****

Праект закону аб вылучэнцах

Падрыхтоўчая камісія СНК БССР уносіць на зацьвярджэньне ў ЦВК і СНК праект пастановы аб вылучэнцах.

Згодна праекту, дзяржаўныя і каапэратыўныя ўстановы і прадпрыемствы разам з адпаведнымі прафсыянальнымі арганізацыямі, не пазьней, як за два месяцы да пачатку бюджэтнага году, павінны вызначыць колькасьць і назвы штатных адзінак, якія могуць быць заняты вылучэнцамі ў гэтых установах і прадпрыемствах.

Вылучэньне рабочых, батракоў і калгасьнікаў на адказную работу ў дзяржаўныя каапэрацыйныя ўстановы і прадпрыемствы праводзіцца агульнымі сходамі цэхаў, або зьмен рабочых, а таксама вытворчымі нарадамі, прафесыянальнымі і грамадзкімі арганізацыямі, мясцовымі выканкомамі, саветамі і іх секцыямі і камісіямі, агульнымі сходамі калгасаў.

Адказнасьць за стварэньне спрыяючых умоў для работы вылучэнцаў усклаецца на кіраўніко ў устаноў і прадпрыемстваў.

Вылучэнцы атрымліваюць заработную плату па стаўках іх пасад, аднак ля менш тэй аплаты, якую яны атрымлівалі да вылучэньня. За вылучэнцамі захоўваюцца ўсе правы і ільготы, якімі яны карысталіся да вылучэньня.

Калі вылучэнец ня адольны выконваць даручаную яму работу, дык адміністрацыя можа праз 6 месяцаў пасьля вылучэньня ўзьняць перад вышэйшым органам пытаньне аб пераводзе вылучэнца на іншую работу, або аб накіраваньні яго на ранейшую работу. Не дазваляецца перавод і звольненьне бяз згоды таго органу, які назначыў вылучэнца.

Вылучэнцы, звольненыя з пасады на працягу першага году іх вылучэньня, з ініцыны ліквідацыі ўстановы або прадпрыемства, няздольнасьці іх да работы, хваробы, а таксама вылучэнцы, якія накінулі работу па сваім жаданьні, маюць права на працягу 3-х месяцаў (а пры хваробе на працягу 4-х месяцаў) пасьля звольненьня, або накіданьня пасады вярнуцца на ранейшую работу ў яны ўстанову ці прадпрыемства, у якіх яны працавалі да вылучэньня. У такім выпадку прадпрыемствы, у якія вярнуліся вылучэнцы, могуць звольніць каго-небудзь, каб даць месца вылучэнцам.

Народныя камісарыяты, выканкомы і саветы павінны, на ўзроўні з прафесыянальнымі саюзамі, арганізаваць паперадню падрыхтоўку кадраў вылучэнцаў.

НА БАРАЦЬБУ ЗА КАДРЫ

НОВЫЯ ЗАВОДЫ—БЕЗ РАБОЧАЙ СІЛЫ

ПАДРЫХТОЎКА КВАЛІФІКАВАНАЕ РАБОЧАЕ СІЛЫ ПАСТАЎЛЕНА КЕПСКА

ДЭФІЦЫТ РАБОЧАЙ СІЛЫ ПАГРАЖАЕ СУР'ЁЗНЫМІ ЎСКЛАДНЕНЬНЯМІ

Красамоўныя абвесткі

У апошні час старонкі мясовых газэт застракацілі нязвычайнымі абвесткамі. «Машынабудаўнічаму заводу «Камунар» патрабуюцца токары, стругальшчыкі і сьлесары», «заводу «Дрэваапрацоўшчык» патрабуюцца кваліфікаваныя рабочыя для песапільнага цэху: 2 варштатныя—рамшчыкі, 1 цыркуляршчык для работы на лінейнай піле, 1 цыркуляршчык для работы на ўпорным століку, 2 качагары».

Варта ўдумацца ў гэтыя абвесткі, каб зрабіць далёка нярпаемны вывад аб рабоце некаторых вышых гаспадарчых арганізацый. Сапраўды, гэтымі абвесткамі гаспадарнікі Мэталятрэсту і Лесбелу абедзьма рукамі расьпісваюцца ў тым, што яны нічога не зрабілі для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Падумаць толькі—каго шукаюць і спадзяюцца знайсьці праз газэтную абвестку нашы гаспадарнікі. Токара і сьлесара, цыркуляршчыка і рамшчыка, гэта значыць якраз тыя катэгорыі рабочых, якія на гэтых вытворчасьцях зьяўляюцца масавымі і якія павінны былі заўсёды знаходзіцца ў рэзэрве.

Аб чым сьведчаць факты?

Больш блізкае знаёмства з ходам падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі пяцігодкі на радзе гаспадарчых арганізацый прымушае нас забіць сур'ёзную трывогу.

Мэталятрэсту яшчэ ў бягучым годзе патрэбна будзе 1.173 кваліфікаваных рабочых, у тым ліку 380 сьлесараў, 160 токараў, 126 фармоўшчыкаў і ліцейшчыкаў і г. д. Дзе-ж ён іх возьме?

Усе крыніцы рабочай сілы для мэталяапрацоўчай прамысловасьці, якія ўлічаны на сёнешні дзень (ЦПП. прафшколы і ўласнае вучнёўства), ледзь могуць даць каля 500 кваліфікаваных рабочых. Такім чынам, ня хопіць калі 700 рабочых, каб запоўніць недахват рабочай сілы па мэталяпрамысловасьці ў бягучым годзе. Гэты недахват ужо дае сябе моцна адчуваць. Лепшы довад—абвесткі заводу «Камунар». Але «Камунар»—не адзіны завод, які ўжо адчувае недахват рабочае сілы. Ня так даўно мы паведамлялі, што і на заводзе «Энэргія» з-за адсутнасьці токараў бязьдзейнічае каля 20 такарных варштатаў, а адміністрацыя віцебскага заводу «Чырвоны Мэталіст» тлумачыць недавыкананьне прамфінпляну адсутнасьцю поўнага кам плекту рабочых у сувязі з... вылучэньнем некалькі дзесяткаў рабоых у савецкі апарат.

Здаецца, такое напружанае становішча, калі вылучэньне ў савецкі апарат некалькіх дзесяткаў рабочых можа рабіць уплыў на выкананьне прамфінпляну, павінна было выклікаць а боку Мэталятрэсту рашучыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы рабочай сілы. На жаль, факты гавораць аб іншым: не аб фарсаваньні падрыхтоўкі рабочай сілы, а аб поўным ігнараваньні ўрадовых дырэктыў у гэтай галіне. Падамо некалькі фактаў.

Рэчаіснасьць і... мары Мэталятрэсту

З набору індустрыялізацыі па долю Мэталятрэсту прыпала падрыхтаваць 70 рабочых, дзеля чаго яму было запрапанавана адкрыць фабзавуч у Гомелі пры заводзе «Пралетары». Мэталятрэст катэгарычна адмовіўся гэта зрабіць, знайшоўшы рад непераможных «труднасьцяй». Прадстаўнік ВСНГБ прымушаны быў выехаць у Гомель і давесьці Мэталятрэсту, што ўсе «труднасьці» вельмі лёгка ўнадаркаваць. І толькі тады фабзавуч быў адкрыты.

Такую-ж цяганіну завёў Мэталятрэст, калі яму запрапанавалі адкрыць фабзавуч у Віцебску на 45 чалавек. Тры месяцы цягнуў Мэталятрэст і адкрыў фабзавуч толькі пад націскам ВСНГ.

Ка і Мэталятрэст склаў праект заводу па вырабе сельска-гаспадарчых машын у Гомелі, ён «забыўся» прадугледзець памяшканьне для фабзавучу.

Возьмем пытаньне аб удзеле Мэталятрэсту ў рабоце ЦПП'у. Паколькі Мэталятрэст усклада на ЦПП паўныя надзеі, ён павінен быў больш цікавіцца сыстэмай работы ЦПП'у і тымі катэгорыямі рабочых, якія ЦПП для яго рыхтуе. Мож на было нават павялічыць колькасьць вучняў мэталяцэхаў на 100-200 проц., але Мэталятрэст лічыць для сябе немагчымым цікавіцца работаю ЦПП'у і прад'яўляюць да яго якія-небудзь канкрэтныя патрабаваньні. І ня дзіва, што адсутнасьць зацікаўленасьці работай ЦПП'у адпаведных гаспадарчых органаў адсутнасьць заявак на паўныя катэгорыі рабочых выклікае сум у кіраўнікоў ЦПП'у, і перад імі гэтымі днямі нават паўстала пытаньне аб... закрыцьці кавальствага цэху.

Але можа Мэталятрэст мяркуе запоўніць недахват рабочай сілы некваліфікаванымі рабочымі, паступова павышаючы іх кваліфікацыю? На жаль, і гэтага няма. У прасоўваньні малакваліфікаваных рабочых няма сыстэмы, з імі ніякай тэхнічнай работы не вядзецца, хаця можна было-б вельмі лёгка, па сыстэме ЦПП'у, падрыхтаваць некалькі сотень кваліфікаваных рабочых.

Такое становішча з кваліфікаванай рабочай сілай па Мэталятрэсьце. Ня лепшае становішча ва Лесбеле.

Лесбел спадзяецца на газэту

На працягу бягучага гаспадарчага году Лесбелу патрэбна 1.30 новых кваліфікаваных рабочых, і ён ужо іх шукае праз газэтную абвестку (завод «Дрэваапрацоўшчык»). Праўда, Лесбел адкрыў некалькі курсаў, якія рыхтуюць малодшы камандны склад для дрэваапрацоўчай прамысловасьці, але гэта не вырашае пытаньня аб недахвае кваліфікаваных рабочых. Ня вырашыць пытаньня і фабзавуч на 100 чалавек, які адкрыты пры камбінаце ў Бабруйску, бо патрэбных рабочых з фабзавучу камбінат атрымае толькі праз два гады.

Кепска з падрыхтоўкай кваліфікаванай рабочай сілы і па Белдзяржбудзе. Кіраўнікі яго позна схамянуліся і толькі ў гэтым годзе адкрылі фабзавучы ў чатырох акруговых гарадох. А летась, калі ВСНГ прапанаваў Белдзяржбуду адкрыць школу фабзавучу на 50 чалавек па падрыхтоўцы ацяпленцаў, Белдзяржбуд пачаў таргавацца, згаджаючыся на 35 чалавек. І толькі пад пагрозаю вымовы адкрыў фабзавуч на 50 чалавек. Спадчына старых тэмпаў будзе каштаваць Белдзяржбуду ня мала. Ужо да пачатку будаўнічага сэзону Белдзяржбуду ня хопіць звыш 2 тысяч кваліфікаваных рабочых. Каб запоўніць гэты недахват, трэба зараз-жа ўзяць рашучы курс на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў, не шкадуючы для гэтага ні сіл, ні сродкаў.

Рыхтуй улетку сані

Зусім ня ўлічваюцца нашымі гаспадарнікамі такія фактары, якія маюць уплыў на стан кваліфікаваных кадраў, як, напрыклад, пераход прадпрыемстваў на бязупынны рабочы тыдзень, вылучэньне рабочых у апарат, мабілізацыя рабочых на розныя ўдарныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва і г. д. Так, на фабрыцы «Дубровенская мануфактура» за апошнія два месяцы вылучана звыш 50 кваліфікаваных рабочых і работніц, якіх вельмі цяжка замяніць, але на зьмену якіх можна было-б падрыхтаваць людзей, калі-б фабрычныя арганізацыі сваячасова аб гэтым паклапаціліся.

Адміністрацыя віцебскай ільнапрадзільнай фабрыкі «Дзьвіна», ведаючы, што фабрыцы запрапанавана перайсьці на бесьперапынны рабочы тыдзень, нічога ня ўжыла для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. У выніку зараз на фабрыцы стаіць пытаньне аб датэрміновым выпуску 3-га курсу фабзавучу.

Прафсаюзы, на лінію агню!

Усе гэтыя факты сьведчаць аб недапушчальных адносінах гаспадарчых органаў да падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых.

Будуюцца новыя прамысловыя гіганты, пашыраюцца старыя фабрыкі і заводы, прадпрыемствы паступова пераходзяць на бесьперапынку, на 2-х і 3-х зьменную работу,—усё гэта патрабуе шматтысячных кваліфікаваных кадраў рабочых. Хто ня ўлічвае ўсёй сур'ёзнасьці пытаньня, той наогул мала што разумее.

Міжарная эканомія на падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, за якою яшчэ ганяюцца многія гаспадарнікі, у перспэктыве пяцігодкі будзе каштаваць краіне вельмі дорага.

Трэба неадкладна дабіцца крутога пералому ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў. І асноўную ролю ў гэтым павінны адыграць нашы прафсаюзы, якія пакуль што адносяцца да гэтага пытаньня бязудзельна, нядбайна, а часамі і бюракратычна.

ПРАЎДЗІН.

Месячнік жывёлагадоўлі

ПРАБЛЕМУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ—У ЦЭНТР УВАГІ

„Пасьля збожжавае праблемы, на шляху вырашэньня якое партыя дабілася першых сур'ёзных посьпехаў, мясная праблема зьяўляецца важнейшай задачай эканамічнае палітыкі партыі і савецкай улады, без вырашэньня якое ня могуць быць ліквідаваны цяжкасьці ў справе забесьпячэньня харчаваньнем рабочае клясы". (*З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б).*

Абагуліць жывёлу ў калгасах, бязьлітасна змагацца з распродажам жывёлы, укамплектаваць калгаснае стада, моцна ўдарыць па кулаку, які шкодзіць калектывізацыі

ПАЛАЖЫЦЬ КАНЕЦ РАСПРОДАЖУ І ЗАБОЮ ПРАДУКЦЫЙНАЕ ЖЫВЕЛЫ

Наркамгандаль БССР абавязаў мясазагатоўчыя арганізацыі перадаваць Белсельтрэсту і калгасам усю прадукцыйную жывёлу, каб ні адна з яе ня трапіла пад нож.

Такія арганізацыі, як Белсельтрэст і Белмалжывсаюз больш за ўсіх павінны быць зацікаўлены ва ўкамплектаваньні гуртоў саўгасаў і калгасаў прадукцыйнай жывёлай.

Між тым, гэтыя арганізацыі адносяцца вельмі нядбайна да адбору прадукцыйнае жывёлы на бойнях. Дагэтуль Белсельтрэстам адабрана ўсяго 2793 галавы і Белкалгассаюзам 5093. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што выкананьне дырэктыў ураду па адборы жывёлы праходзіць вельмі павольна.

За апошні час наглядаўся рад фактаў, калі адабраная жывёла па некалькі тыдняў заставалася на пунктах Белмясгандлю. Такія выпадкі здарыліся ў Менску і Мазыры. Гэта здараецца і зараз.

Пункты Белмясгандлю прыстасаваны толькі для кароткага знаходжаньня ў іх жывёлы, якая ідзе на ўбой. Гэтыя пункты зусім вягодныя для трыманьня прадукцыйнае жывёлы, якая патрабуе асаблівага дагляду. Таму пры доўгім трыманьні на базах Белмясгандлю прадукцыйная жывёлы, апошняя на доўгі час перастае быць прадукцыйнай. Аб гэтым забываюць як калгасы, так і Белсельтрэст.

Штогодна ў БССР забіваецца вялікая колькасьць цялят і парасят. Так, за 1928-29 год у 36 бойнях БССР было зарэзана звыш 28 тыс. цялят.

Гэтыя лічбы гавораць пра тое, што адначасова з адборам жывёлы трэба таксама паставіць пытаньне аб захоўваньні маладняку.

Белсельтрэст, Белкалгасцэнтр і Белмалжывсаюз, якія праводзяць адбор і загатоўку жывёлы для калгасаў, павінны з усёй сур'ёзнасьцю аднесьціся да выкананьня ўскладзеных на іх задач.

Усе загатоўчыя арганізацыі таксама павінны памятаць аб тэй адказнасьці, якая ўскладзена на іх у галіне адбору прадукцыйнае жывёлы і ні ў якім разе не дапускаць убою жывёлы здатнае для калгасаў.

Калгасы і саўгасы павінны сваячасова падрыхтаваць да прыёмкі годнае для іх жывёлы, вылучыўшы для гэтае работы спэцыяльных працаўнікоў.

Месячнік жывёлагадоўлі, які зараз праводзіцца, павінен палажыць канец распродажу жывёлы з прыцягненьнем вінаватых у гэтым да суровай адказнасьці. Актыўны ўдзел грамадзкіх арганізацый, рабочых гораду і бядняцка-серадняцкага сялянства дапаможа пасьпяховаму правядзеньню месячніка.

ВІЛЬКАМІРСКІ.

Да адказнасьці за нездавальне малака каапэрацыі

Ня гледзячы на тое, што ў Менску зараз адчуваецца нястача малака, рад буйных прыгарадных саўгасаў і калгасаў не здаюць малака каапэрацыі і не прапускаюць яго праз цэнтральную малочную.

Саўгасы: «Негарэпае», «Дукоры», «Тытва», «Блонь», «Зарэчча», «Сёмкава», «Міхайлава» і «Сеньніцы», ня гледзячы на даныя ім дырэктывы, не здаюць малака каапэрацыі. Да гэтага сьпісу трэба дадаць таксамэ калгасы імя Карла Маркса, «Новае Жыцьцё», «Копас» і імя Фрунзаўскага райкому.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці кіраўнікоў і старшынь гэтых саўгасаў і калгасаў.

Бядняцка-серадняцкая маса калгасьнікаў павінна арганізаваць грамадзкі кантроль за тым, куды дзяюцца лішкі малака.

Колькасьць дастаўкі малака на цэнтральную малочную зьменшылася. Такому зьявішчу трэба палажыць канец.

РЭАГУЮЧЫ.

За сацыялістычную рэканструкцыю жывёлагадоўлі

Месячнік жывёлагадоўлі, які зараз праводзіцца па БССР, мае на мэце мабілізаваць увагу ўсяе савецкае грамадзкасьці, рабочае клясы, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства наўкола пытаньняў далейшага разьвіцьця жывёлагадоўлі.

Каб затрымаць калгасны рух, кулацтва зараз вядзе сярод беднаты і сераднякоў шалёную агітацыю за распродаж жывёлы перад уступленьнем у калгасы. Таму адной з асноўных задач месячніка зьяўляецца рашучая барацьба з кулакамі і шырокая растлумачальная работа сярод бядняцка-серадняцкіх мас сялянства аб тэй вялізарнай шкодзе, яную яны прыносяць калгаснаму і сацыялістычнаму будаўніцтву, а таксама і добрабыту працоўных мас сялянства і рабочае клясы масавым продажам і зьнішчэньнем рабочай і прадукцыйнай жывёлы.

Трэба адзначыць, што да гэтага часу яшчэ ня ўсе арганізацыі ўсьвядомілі ў належнай меры сур'ёзнейшае гаспадарчае і палітычнае значэньне жывёлагадоўчае праблемы.

Сучаснае становішча жывёлагадоўлі і тэмп работы ў гэтым напрамку не забясьпечвае пасьпяховага выкананьня вызначаных партыяй мерапрыемстваў па ўздыме і сацыялістычнай рэканструкцыі гэтай важнейшай галіны сельскае гаспадаркі.

На працягу месячніка трэба дабіцца пералому ў рабоце па жывёлагадоўлі. Апошняя павінна заняць адно з цэнтральных месц у рабоце партыйных, савецкіх і каапэрацыйных органаў, бо толькі пры гэтай умове мы можам разьлічваць на хуткі пералом у разьвіцьці жывёлагадоўлі.

Месячнік павінен ператварыцца ў шырокую грамадзкую кампанію па павышэньні колькасьці жывёлы ў калгасах, па аграмаджаньні жывёлы і кармоў, пабудовы калектыўных хлявоў і арганізацыі буйных малочных, малочна-гародных, бульбяна-жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых савецкіх калектыўных гаспадарак.

Стварэньне кармавое базы, разьвядзеньне сіласных культур, пабудова сіласных вежаў і ям—усе гэтыя пытаньні таксама зьяўляюцца важнейшымі задачамі месячніка.

Арганізацыя буйных племянных і прамысловых птушніцкіх гаспадарак, гадоўля маладняка, кантрактацыя жывёлы на племя, бэкон і алкорм, арганізацыя злучных пунктаў, кантрактацыя малака, правядзеньне зоавэтэрынарнага мінімуму—вось пытаньні, наўкола якіх павінна быць згуртавана ўвага васколькі грамадзкасьці.

Трэба разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію на вёсцы, выкрываючы перад беднякам-серадняком масамі сялянства шкодніцтва кулацкіх элемэнтаў. Трэба азнаёміць сялянства з мерапрыемствамі ўлады па сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Кожная арганізацыя, пачынаючы ад наркамату і канчаючы сельсаветамі і малочна-жывёлагадоўчымі таварыствамі, павінна зараз-жа закасаўшы рукавы пабальшавіцку ўзяцца за работу па сацыялістычнай рэканструкцыі жывёлагадоўлі на падставе ўліку канкрэтных умоў кожнага раёну і сельсавету, на падставе максымальнага павышэньня самадзейнасьці і актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас сялянства.

МАРКАЎ.

Калгасы чакаюць рахункаводаў

а вярбоўка добраахвотнікаў-рахунковых працаўнікоў праходзіць слаба

Бурны рост калгаснага будаўніцтва, пераход многіх раёнаў БССР на суцэльную калектывізацыю паставілі перад саюзам саўгандальслужачых і перад рахункаводнымі работнікамі задачу—рэальна дапамагчы наладжаньню рахункаводзтва ў калгасах.

Баявая задача арганізацый рахункаводных работнікаў у самы кароткі тэрмін завербаваць, на падставе добраахвотніцтва, кваліфікаваных, палітычнавытрыманых рахункаводаў на пастаянную і часовую работу ў калгасы.

Як-жа ідзе вярбоўка рахункаводаў у калгасы?

Там, дзе кіраўніцтва здолела арганізаваць ініцыятыву, сталь на чале добраахвотніцтва, там мы маем добрыя вынікі.

Бабруйскія рахунковыя работнікі выканалі заданьне з перавышэньнем. Навербавана добраахвотнікаў на пастаянную работу 35 чал., на часовую—50 чал. Ужо арганізуюцца кароткатэрміновыя курсы для будучых працаўнікоў калгасаў. У Полацку абвясьцілі сябе добраахвотнікамі 50 чал.

У **Гомелі** саюз саўгандальслужачых аказаўся ў баку, а акрыпрафбюро спачатку нават забараніла заняцца вярбоўкаў. Ёсьць пагроза сваячасоваму выкананьню заданьня.

У **Магілеве**—акруге суцэльнай калектывізацыі—там, дзе патрабуецца каля 800 разункаводных работнікаў у калгасы, вярбоўка на пастаянную работу прадукае слаба. Мясцовы калгассаюз праяўляе невыстарчальную актыўнасьць.

Рэкорд закасьцяпеласьці і марудносьці пабілі віцебскія арганізацыі. Старшыня бюро віцебскага ару Равін лічыць, што «нельга агаліць рахункаводны апарат у горадзе», «калгасы могуць пачакаць, пакуль курсы выпусьцяць рахункаводаў». Акрпрафбюро пакуль што не дазволіла распачаць вярбоўку. Мясцовы калгассаюз усё яшчэ ня ведае, дзе яму патрэбны рахункаводныя работнікі. Рахункаводныя работнікі г. Віцебску не мабілізаваны на выкананьне адказьнейшай палітычнай задачы.

Ворша і Мазыр чакаюць спэцыяльных цыркуляраў і новых дырэктыў.

Папярэдняя вынікі па г. Менску такія:

ЦП саюзу саўгандальслужачых і Белбюро ару паставілі на ногі актыў, мабілізавалі ўвагу шырокай масы рахункаводных працаўнікоў на вярбоўку добраахвотнікаў. Аднак, вынікі пакуль што нельга прызнаць пасьпяховымі Хоць заданьне на вярбоўку 141 ч. на часовую работу выканана з перавышэньнем, але на пастаянную работу пакуль што згадзілася толькі 50 проц. патрэбных кадраў. Нізавыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, мясцкомы яшчэ ня ўсюды дапамагаюць ударнаму выкананьню заданьня.

Тэмп вярбоўкі ва ўсіх акругах павінен быць узмоцнены. У бліжэйшы тыдзень вярбоўка павінна быць закончана як-бы там ні было.

КРАСНАПЕРКА.

Сэсія савету Калгасцэнтру БССР

Не цыркуляр, а ініцыятыва і самадзейнасьць

забясьпечаць посьпех калгаснага будаўніцтва

Выступаўшыя ў спрэчках на сэсіі савету Калгасцэнтру БССР таварышы з месц, адзначаючы выключна шпаркі тэмп калектывізацыі па ўсіх акругах Беларусі, разам з тым, падкрэсьлівалі неабходнасьць урэшце выразна паставіць працу акруговых і цэнтральных устаноў. Зусім правільныя былі абвінавачаньні па адрасе Калгасцэнтру БССР у тым, што ён слаба зьвязаны з мясцамі, несваячасова дае прынцыповыя паказаньні і інструкцыі па радзе важнейшых пытаньняў, напрыклад, абагуленьні жывёлы, насенных фондаў і г. д.

Побач з гэтым, трэба адзначыць, што на сэсіі былі чутны наўна беспадстаўныя абвінавачаньні акруговых і цэнтральных устаноў.

З аднаго боку былі чутны скаргі, што абагульваць жывёлу вельмі цяжка і немагчыма з прычыны адсутнасьці цьвікоў для будаўніцтва абагуленых хлявоў, а а другога боку пацьвярджалі, што пры поўным жаданьні і энэргіі цьвікі можна заўсёды дастаць, нават у саміх сялян і што цьвікі і аналёгічныя іншыя аграворкі не зьяўляюцца сур'ёзным матывам для адкладваньня абагульваньня жывёлы.

Вельмі дрэнна з абагуленьнем насенных фондаў — гэта сьцьвярджала большасьць выступаўшых. Згодна заявы старшыні праўленьня Белпаляводсаюзу тав. Дубіны, да сучаснага моманту калгасамі выканана заданьне па стварэньні насенных фондаў і загатоўцы насеньня ў разьмеры 21,5 проц. Бязумоўна гэта лічба перапавялічана на проц. 8.

Недапушчальныя адносіны заўважаюцца з боку калгасаў да выкананьня абавязкаў па кантрактацыі. На 20 студзеня заданьне па кантрактацыі імі выканана: па збожжавых культурах — на 70 проц., па бульбе — на 42 проц., па ільнанасеньні — на 53 проц., па насеньні канюшыны — на 7 проц., лубіне— на 0,7 проц., а па сэрадэлі — на 0 проц. Калі так будзе працягвацца далей, дык пашырэньню яравога кліну ў БССР на 6 проц. пагражае зрыў. Такое становішча з выкананьнем заданьня па кантрактацыі наводзіць на думку, што насеньне або прадаецца, або ўтойваецца. Аб гэтым сьведчыць рад фактаў, якія паведамляюцца прэсай.

Усім вядома, што мінэральнымі ўгнаеньнямі БССР здавальняецца ў далёка недастатковай ступені. Між тым, ні калгасы, ні адпаведныя арганізацыі ня прымаюць амаль ніякіх мер да арганізацыі збору попелу і скарыстаньня мясцовых рэсурсаў наогул.

Выключна дрэнна ідзе падрыхтоўка да будаўніцтва ў калгасах. Арганізаваны Калгасбуд існуе толькі на паперы, бо ён складаецца з аднаго інжынэра і аднаго тэхніка. Ніхто не распрацоўвае ні будаўнічых плянаў, ні праектаў. Ніякага тэхнічнага нагляду над тым, што будуецца зараз у калгасах, таксама няма.

Завоз машын, які пачаўся, дае рад фактаў нядобрасумленных адносін некаторых фабрык і заводаў да выпрацоўкі добраякаснае прадукцыі. З атрыманых, напрыклад, Бабруйскай акругай 40 збожжачышчальных машын, ні адна ня мае сіт. Калі ўрэшце сіты машын, якія ўжо працуюць, дык машыны выходзяць са строю, бо нельга дастаць іншых сіт і ніхто іх не прысылае. Ня лепш і на вапнавых млынох. Запасныя часьці, папершае, атрымліваюцца з вялікім спазьненьнем і, падругое, ня могуць быць скарыстаны, бо не адпавядаюць патрэбным разьмерам. У выніку гэтага, прыходзіцца рабіць запасныя часткі саматужным парадкам, у сялянскіх кузьнях, але і гэта не заўсёды магчыма, з прычыны адсутнасьці мэталю.

З вапнаваньнем наогул справа стаіць дрэнна. Сабекошт тоны вапны складае 13-15 руб. Прадаецца-ж яна па 3 руб. 60 кап. Гэткая ненармальнасьць тлумачыцца, галоўным чынам, вялікімі выдаткамі па здабываньні і перапрацоўцы вапны і па яе транспартоўцы. Неабходна спыніць перавоз вапны на далёкія адлегласьці, бо гэта вельмі нерэнтабэльна.

Наколькі мала ўвагі зварочваюць на калгасы гандлёвыя ўстановы сьведчыць той факт, што ў калгасах нават няма вагаў. З прычыны адсутнасьці вагаў, насеньне пры абагуленьні насенных фондаў прымаецца ад калгасьнікаў не на вагу, а на вока.

Выявіўся, між іншым, цікавы факт: да 300 тыс. руб. крэдыту яшчэ дагэтуль не спагнана з кулацкіх гаспадарак у БССР.

В.

Сельсаветы не змагаюцца супроць забою жывёлы

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Зоакамісіі пры бойнях адносяцца вельмі нядбайна да сваіх абавязкаў. Члены зоакамісій часта аглядаюць жывёлу, якую прывозяць для забою, не на бойні, а ў сябе дома. Такое зьявішча прыводзіць да вельмі сумных вынікаў. Напрыклад, у Буда-Кашалёўскім раёне да зоатэхніка прывялі старую карову, якую ён дазволіў зарэзаць на мяса. Але па дарозе гэтую карову падмянілі іншай і была зарэзана прадукцыйная жывёла, якая павінна была гэтымі днямі ацяліцца.

У Цэрахаўскім раёне сельсаветы прападалі ўсіх сваіх быкоў-вытворцаў. У Часа-Руднянскім сельсавеце. Веткаўскага раёну, сяляне таксама зарэзалі быкоў-вытворцаў, а мяса падзялілі паміж сабою. Сельсаветы не вядуць барацьбы з вінаватымі ў злосным забоі жывёлы.

У Гомельскай акрузе пітн правядзень ня месячніка жывёлагадоўлі ўжо расасланы ў раёны. Апошнія даводзяць гэтыя пляны да сельсаветаў. Райвыканкомамі вылучаюцца працаўнікі, якія нясуць адказнасьць за правядзеньне месячніка. На працягу месячніка вызначана абагуліць усю жывёлу і коняй у калгасах, камунах і арцелях.

У Гомельскай акрузе вызначана арганізаваць 18 жывёлагадоўчых і гарадна-жывёлагадоўчых гаспадарак. Для стварэньня кармавое базы будзе пашырана пасеўная плошча траў, коранаплодаў і сіласных культур.

У кожнай вёсцы будуць вылучаны зоаэтэпоўпаважаныя.

Для рабочых саўгасаў і калгасьнікаў будуць праведзены дзесяцідзённыя практ тычныя паказальныя курсы па жывёлагадоўлі. У часе месячніка будзе арганізавана праверка складу малочных таварыстваў і чыстка апошніх ад кулацкіх элемэнтаў.

Уся жывёла, вульлі і інвэнтар кулацкіх гаспадарак улічваюцца У кулакоў, якія будуць выступаць актыўна супроць калгасаў і зьнішчаць жывёлу, будзе праведзена канфіскацыя ўсіх сродкаў вытворчасьці, жывёлы і зямлі.

Месячнік павінен стаць пералочным пунктам у разьвіцьці жывёлагадоўлі на Гомельшчыне.

Рабочыя дапамогуць забясьпечыць Менск малаком

Учора пры штабе цэнтральнае брыгады па аглядзе рабочае каапэрацыі адбылася нарада рабочых, вылучаных для ўдзелу ў кампаніі кантрактацыі малака. У нарадзе прынялі ўдзел рабочыя заводаў «Бальшавік», «Камунар», «Чырвоная Зорка» і інш.

Нарада прызнала патрэбным, каб з 2-га лютага рабочыя брыгады выехалі ў бліжэйшыя раёны Менскай акругі для правядзеньня кантрактацыі малака. Брыгады прабудуць у раёнах 3-4 дні, дзе пра вядуць сумесна з мясцовымі арганізацыямі сходы, дапамогуць заключыць дагаворы.

Трэба адзначыць, што, калі кантрактацыя малака будзе поўнасьцю праведзена, дык штодзённа ў Менск будзе завозіцца да 30 тыс. літраў малака, у той час, калі зараз завозіцца ня больш 5 тыс. літраў у дзень.

Да гэтага часу ў радзе месц не зварачаюць належнай увагі на пытаньне кантрактацыі малака. Напрыклад, у Каралішчавіцкім сельсавеце, Самахвалавіцкага раёну, у Сеньніцкім с

Мощны ўдарыць па кулацкай агітацыі

УСЕ ВОЛЬНЫЯ СРОДКІ НАСЕЛЬНІЦТВА— У АШЧАДНЫЯ КАСЫ

Нашы клясавыя ворагі, якія амагаюцца супроць усіх мерапрыемстваў савецкае ўлады—супроць індустрыялізацыі краіны, супроць калектывізацыі сельскай гаспадаркі,—таксама выступаюць супроць нашых пазык, супроць ашчадных кас, якія збіраюць дадатковыя сродкі на сацыялістычнае будаўніцтва.

Напрыклад у Магілеўскай акрузе, у адным з раёнаў, кулакі пачалі распаўсюджваць чуткі, што ў бліжэйшы час савецкія грошы будуць штэмпэляваць, і курс на іх будзе ніжэй на 30 проц. Няма чаго гаварыць аб недарэчнасьці гэтае правакацыі, бо якраз такое мерапрыемства было-б не на руку савецкаму ўраду і працоўным і прыяло-б да расхістваньня ўстойлівасьці савецкае валюты, якая грунтуецца на нашых поспехах у сацыялістычным будаўніцтве.



Ашчадкаса ў калгасе

Падобная-ж правакацыя мела месца ў некаторых гарадох, у тым ліку і ў Менску. Тут ужо галоўным чынам арудуе нэпман. Калі на Ляхаўцы было арганізавана камсамольскае аддзяленьне ашчадкасы, зьявіліся чуткі, што яно створана для таго, каб раскрыць прозьвішча ўкладчыкаў і сумы ўкладаў. Беспадстаўнасьць гэтых чутак відавочная, бо ашчадкасы за раскрыцьцё таямніцы ўкладаў прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

У Віцебску, у сувязі з арыштам кіраўнікоў таварыства ўзаемнага крэдыту за розныя злоўжываньні, нэпманы распусьцілі чуткі, што ашчадкаса спыніла выдачу ўкладаў сваім укладчыкам. Некаторыя ўкладчыкі пасьпяшыліся атрымаць свае грошы, але, атрымаўшы іх без усякіх затрудненьняў, яны тут-жа папажылі іх назад.

Уся гэта правакацыйная работа нашых клясавых ворагаў мае на мэце—рагаў супроць ашчадкас не дасягае мэты. Працоўныя вераць сваёй пралетарскай дзяржаве, якая стаіць на варце інтарэсаў савецкай краіны і ўсіх працоўных.

Тым ня менш, ня гледзячы на гэтыя вялізарныя посьпехі ў справе ашчаднасьці, трэба арганізаваць рашучы адпор выпазкам клясавага ворага, вырваць з-пад яго ўплыву тую частку працоўнага сялянства, якая яшчэ добра не зразумела сваіх клясавых інтарэсаў.

У месячнік зьберажэньняў трэба выкрыць кулацкую хлусьню на савецкія ашчадкасы, растлумачыць бяднацка-серадняцкім масам праўду аб ашчадных касах, пераканаць іх у тым, што, падтрымліваючы дзяржаўныя ашчадныя касы, працоўнае сялянства дапамагае будаваць сацыялістычную гаспадарку, ня кажучы ўжо аб тым, што з вялікай карысьцю для сябе захоўвае свае працоўныя зьберажэньні і вольныя сродкі.

Д.

Хроніка месячніка

— 2-га лютага на пасяджэньні цэнтральнай камісіі дапамогі дзяржкрэдыту і ашчаднай справе пры прэзыдыуме ЦВК БССР будуць заслуханы даклады кіраўніцтва ашчадкасамі БССР, Беларускай акругі сувязі, ЦСПСБ, Гомельскай акруговай камісіі дапамогі і інш. арганізацый—аб падрыхтоўцы да «месячніка ашчаднасьці».

***

— 1-2 лютага прадстаўнікі цэнтральнай камісіі дапамогі і кіраўніцтва ашчадкасамі БССР выяжджаюць у акругі БССР для правядзеньня кампаніі месячніка ашчаднасьці.

***

Цэнтральнай камісіяй дапамогі дзяржкрэдыту і ашчадкасам пры ЦВК БССР, супольна з кіраўніцтвам ашчадкасамі БССР, выпушчана памятка для камісій дапамогі дзяржкрэдыту пры асобных прадпрыемствах і ўстановах аб іх працы па месячніку.

***

— Рад прафсаюзных арганізацый заключыў сацыялістычныя дагаворы з кіраўніцтвам ашчадкасамі БССР.

ЦП саюзу саўгандальслужачых абавязалася ўцягнуць праз свае нізавыя ячэйкі на 100 тыс. рублёў сялянскіх укладаў; ЦП саюзу асьветы прыняло выклік саюзу саўгандальслужачых і таксама абавязалася ўцягнуць у ашчадкасы 100 тыс. рублёў; саюз нархарч заключыў умову на ўцягненьне ад членаў свайго саюзу 50 тысяч рублёў.

Вучот спэцыялістых народнае гаспадаркі

Згодна пастановы ЦВК БССР зараз пачынаецца вучот спэцыялістых народнае гаспадаркі БССР.

На вучот павінны быць узяты ўсе спэцыялістыя, якія скончылі або не скончылі спэцыяльныя навучальныя ўстановы, а таксама асобы, якія ня маюць адпаведнай асьветы, але працуюць у якасьці спэцыялістых - практыкаў.

Вучот спэцыялістых мае выключна важнае значэньне зараз, калі патрэбна плянаваньне падрыхтоўкі новых кадраў спэцыялістых, калі перад усімі намі паўстае задача забясьпечыць сацыялістычнае будаўніцтва патрэбнымі кадрамі кваліфікаваных працаўнікоў.

Вучот ускладзены на органы Наркампрацы. Створаюцца спэцыяльныя міжведамственыя вучотныя камісіі пры акруговых інспэкцыях і біржах працы.

Арганізацыі інжынэрна - тэхнічных працаўнікоў павінны дапамагчы органам Наркампрацы ў свалчасовым вучоце інжынэрна - тэхнічных сіл, павінны вылучыць сваіх прадстаўнікоў у вучотныя камісіі.

Трэба шырока растлумачыць значэньне вучоту сярод ІТР, дабіцца, каб усе спэцыялістыя ў вызначаныя тэрміны зьявіліся на рэгістрацыю.

САФАРЭВІЧ.

Буйныя заказы ад ангельскіх і турэцкіх фірмаў

Белшклатрэст атрымаў заказ вырабіць для ангельскіх фірмаў 35.000 скрынь шклянак на суму паўтара мільёна рублёў. Заказ павінен быць выкананы на працягу гэтага году. Узоры заказу пасланы на гуту імя Домбаля.

Зараз гуту імя Домбаля выконвае заказ на [illegible]000 шклянак для Турцыі. Апрача [illegible] 1 вагон з начыньнем будзе накіраваны ў Літву.

Трамвай дозна абслугоўвае прыезджых

За апошні час нагляда́ецца дрэннае абслугоўваньне трамваем прыезджых. Паводле пастановы Менгарсавету, трамваі павінны пачынаць работу з 6 гадзін раніцы. Але гэта пастанова застаецца толькі на паперы. Частка пягнікоў прыбывае раніцою а 6-й гадзіне, а трамвай заўсёды, на жаль, спазьняецца.

25-га студзеня трамваі прышлі са спазьненьнем на 45 мінут. Ля астаноўкі сабраўся вялікі натоўп, і калі запыталіся ў кантралёра аб прычыне спазьненьня, кантралёр адказаў: «ня ваша справа», і адмовіўся назваць сваё прозьвішча.

Г.

Перарэгістрацыя заборных кніжак

З 6 па 20 лютага будзе праведзена перарэгістрацыя заборных кніжак вайскова-служачых. Перарэгістрацыю правядуць каапэрацыйныя камісіі і ўпаўнаважаныя гарнізонных частак. Перарэгістрацыі падлягаюць усе вайскова-служачыя і іх утрыманцы, якія ня маюць самастойнага заработку. Вайскова-служачыя, якія маюць права на атрыманьне заборных кніжак, прылічваюцца да першай катэгорыі—«рабочых», іх сем'і да другое катэгорыі—«служачых».

Пры перарэгістрацыі трэба мець каапэрацыйную кніжку (для пайшчыкаў), хлебную кніжку, дамавую кнігу, справку ад загадчыка гаспадаркай аб знаходжэньні на харчаваньні, аб зарплаце і аб ліку едакоў.

***

— З 20 лютага Менскі хлебазавод з прычыны рамонту спыняе працу на 10 дзён (па 1 сакавіка). Спажыўцом замест печанага хлеба МЦРК будзе адпускаць муку з разьліку за кгр. печанага хлеба —700 грам мукі, палова якой будзе пшанічная, а другая палова—жытняя.

Выдача мукі пачнецца з 5 па 15 лютага ўключна. Мука будзе адпускацца з прадуктовых крам, да якіх пайшчыкі прымацаваны. Чыгуначнікі атрымаюць муку замест хлеба з крам ТПО.

— З 2 лютага МЦРК пачынае адпускаць пайшчыкам—крупы па 1½ кгр. рабочым і па 1 кгр. іншым пайшчыкам па талёне жоўтага колеру № 183; селядцоў па ½ кгр. на едака па талёне жоўтага колеру № 184; салёную рыбу па ½ кгр. на едака; макароны па 200 грам на едака па талёне жоўтага колеру № 186; бульбяную муку па 200 грам на едака; мыла гаспадарчае на 1-2 чал.—1 кавалак, на 3-4 чал.—2 кавалкі і 5—і больш чал.—3 кавалкі, па талёне ружовага колеру № 105.

Сынагогу пад курсы манцёраў

Гарсавет пастанавіў перадаць Азэту памяшканьне сынагогі, якое знаходзіцца на вуліцы 1-ай Лекерта. У сынагозе будуць адкрыты курсы манцёраў для перакваліфікацыі яўрэйскай працоўнай моладзі.

Работніцы менскіх жактаў здаюць каштоўныя рэчы ў фонд індустрыялізацыі

Рэлігійныя прылады— на патрэбы індустрыялізацыі

МАЗЫР (наш кар.). Першы пачатак зрабіла гарадзкая канфэрэнцыя жонак рабочых. Жонкі рабочых з грыбуны выкінулі лёзунг: «здаваць усе рэлігійныя прылады хатняга ўжытку саюзу бязбожнікаў і на сабраньня ад продажу іх сродкі пабудаваць трактарную калёну».

Лёзунг гэты быў падхоплены ўсёй савецкай грамадзкасьцю акругі. Старыя кабеты, дзеці, моладзь зьбіралі падсьвечнікі, пярсьцёнкі і інш. р чы і ўносілі іх у ячэйкі бязбожнікаў. Акруговы савет саюзу бязбожнікаў мяркуе сабраць ня менш 3-х вагонаў рознага каштоўнага металю.

****

10 мільёнаў рублёў на пабудову механізаванае гуты

Гэтымі днямі ў Беларусь прыяжджае тэхнічны персанал маскоўскае будаўнічае арганізацыі «Теплострой», з якою заключаны дагавор на пабудову калі Гомелю буйное механізаванае гуты на суму звыш 10 мільёнаў рублёў. Праект гуты зацьверджаны ВСНГ БССР. Вытворчая праграма гуты разьлічана на выраб 22 тыс. тон шкла на год. Будаўнічыя работы пачнуцца ўжо ў гэтым годзе з тым, каб работы першай чаргі былі скончаны ў сьнежні 1931 году.

Батракоў і беднякоў—на работу ў каапэрацыі

5-га лютага ў Менску адкрываюцца пяцімесячныя курсы па падрыхтоўцы батракоў і беднякоў для работы ў спажывецкіх таварыствах. Курсы разьлічаны на 50 чалавек Белкаапсаюз забясьпечвае курсантаў харчаваньнем і інтэрнатамі. 20-га лютага пры Белкаапсаюзе адкрываюцца трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы работнікаў для хлебазаводаў і хлебапякарань.

Нафтавыя бакі для забесьпячэньня трактараў гаручымі матар'яламі

Белкаапсаюз пастанаўіў пабудаваць у Магілеўскай акрузе 8 нафтабакаў для хаваньня і забесьпячэньня трактараў і іншых с.-г. машын гаручымі матар'яламі.

Спажывецкая каапэрацыя не кантралюе якасьці тавараў

У Менск прыехала ўпоўнаважаная галянтарэйнага аддзелу т. Талачынская. Яна абсьледвала каапэрацыйны гандаль галянтарэйна-трыкатажнымі вырабамі. Артыкул тав. Талачынскай аб якасьці вырабаў саматужна-прамысловай каапэрацыі мы сёньня друкуем.

Якасьць тавараў, якія вырабляюцца арцелямі саматужнай каапэрацыі, мае вялікія дэфэкты. Арцелі, што робяць галянтарэйна-трыкатажныя тавары, выпускаюць бракаваную прадукцыю да 50-60 проц.

Якасьць панчох і шкарпэтак увесь час не паляпшаецца: вязка вельмі рэдкая, нагладжаюць цыраваньні і дзіркі, у адной пары сустракаюцца розныя панчохі, фарбуюцца няправільна—ёсьць плямы і пацёкі.

Штучныя трыкатажныя вырабы прымушаюць жадаць шмат лепшага: рэйтузы разлазяцца, сьвідры не адпавядаюць устаноўленым разьмерам, многа дзірак і цыраваньняў.

У бялізьне паміма неахайнасьці ў рабоце, назіраюцца вялікія брыдоты—«адна калошка большая за другую».

У грабянёх, гузіках, люстравым і скураным тавары назіраецца таксама шмат браку.

Нядобраякасны тавар вырабляе менская арцель «панчошнікаў», бабруйскі працкалектыў, магілеўскі сампрамсаюз, віцебскі сампрамсаюз, магілеўская «Чырвоная Швэйка», арцель менскіх люстэрнікаў, арцель «Жемчужина» і г. д.

Рэгулюючыя органы і спажывецкая каапэрацыя не вялі сыстэматычнага нагляду за якасьцю саматужных галянтарэйна-трыкатажных тавараў.

Белкаапсаюз 6-7 месяцаў таму назад правёў кампанію паляпшэньня якасьці: былі абсьледаваны арцелі «Самавязь», «Новы шлях», арцель панчошнікаў, арцель трыкатажнікаў і яшчэ некаторыя арцелі, якія вырабляюць галянтарэйна-трыкатажныя тавары. Прыняты рад мер па аб'яднаньні панчошных арцелей, па ўпрашчэньні асартымэнту.

За апошні час ніякай работы па паляпшэньні якасьці Белкаапсаюз не вядзе, складаюцца толькі акты на частку дэфэктнага тавару і пасылаюцца пісьмовыя напамінкі каапэрацыйнай сыстэме аб неабходнасьці нагляду за якасьцю.

Пралстаўнікі райсаюзаў і ЦРК таксама пытаньнем аб якасьці не займаліся, некаторыя арганізацыі нават не складалі актаў на дэфэктны тавар, бо не хацелі псаваць «мірных, добрых адносін з арцелямі», бо такія арганізацыі, як віцебскі сампрамсаюз, адкрыта заяўлялі віцебскаму райсаюзу: «калі вы будзеце складаць акты на дэфэктныя тавары, мы вам тавару даваць ня будзем».

Кан'юнктура на гэтыя тавары была вельмі высокая, спажывец браў усё, а таму стымулю да паляпшэньня якасьці ня было.

Такога становішча ня можа быць дапушчана.

Трэба прыняць тэрміновыя мерапрыемствы да паляпшэньня якасьці тавараў, усямерна прыцягваючы да гэтага грамадзкасьць у асобе эканомкамісій, рабочых брыгад, крамных камісій і каапэрацыйнага актыву.

У сувязі з пераходам спажывецкай каапэрацыі на новыя формы работы і барацьбой за павышэньне рэальнай заработнай платы, трэба ўстаноўіць пэрсанальную адказнасьць работнікаў спажывецкай і прамыслова каапэрацыі, якія павінны весьці сыстэматычны нагляд за якасьцю тавараў: устанавіць прыёмку і браковку тавараў; сыстэматычна абсьледаваць арцелі, якія вырабляюць нядобраякасную прадукцыю; нападжваць паказальныя суды над арцелямі, што выробляюць нядобраякасную прадукцыю; спыніць выдачу сырцу арцелям, якія выпускаюць шмат браку; арганізаваць спэцыяльныя выстаўкі і вітрыны бракаваных тавараў; арганізаваць сыстэматычныя нарады па пытаньні аб якасьці тавараў.

ТАЛАЧЫНСКАЯ.

Што зроблена па лістох рабселькораў

— Зьняты з работы сын папа Быкоўскі, які працаваў кіраўніком спраў Мазырскага акруговага аддзяленьня саюзу сельгаспрацоўнікаў.

— Зьняты з работы Каўбасьнікаў і яго шваГер Кантаровіч за злоўжываньні ў інвалідзкай арцелі «Чырвоная Зорка» (Слуцак).

— Зьняты з работы па другой катэгорыі камісіяй па чыстцы савецкага апарату рахункавод Каўбскага спажывецкага т-ва Кардневэй за злоўжываньне па падвышэньні цэн, каб гэтым самым пачаць судовую справу супроць старшыні т-ва.

— Аўтабусны рэйс Халопенічы—Крупкі, як паведаміў нам Аўтатранс, мяркуецца ўстанавіць з вясны гэтага году.

— Выключаны з ліку праваабаронцаў Лютноўскі паводле заметкі «Абшарнік абараняе рэвалюцыйную законнасьць», у часе чыткі савецкага апарату Аршанчыны.

Аршанская таварная станцыя завалена грузамі, якія перашкаджаюць нармальнай работе. Заметка пасылалася на расьсьледваньне, і паказаныя факты пацьвердзіліся. Зараз таварная станцыя для ліквідацыі і сваячасовага вывазу грузаў узмоцнена 2 аўтамашынамі і лежа ліквідавана.

Зьняты з работы і выключаны з саюзу

На Мазырскай хлебапякарні ЦРК культурна-масавая работа не праводзілася. Замест культработы шырока было развернута п'янства, хуліганства, злоўживаньня і антысэмітызм. На выпадкі антысэмітызму з боку рабочага Бабіны грубіянам сваячасова не рэагаваў. Заметка «Няма культуры» пасылалася рэдакцыяй на расьсьледваньне, і толькі пасьля гэтага групком занарушыўся. У выніку Бабіна зьняты з работы і агульным сходам выключаны з саюзу на 3 месяцы. Вайсману за пакражу булак групком вынес суровую вымову.

Прымусілі заплаціць

Заметка «Як Бягомльскія гандляры займаюцца пяганінай» пасылалася на расьсьледваньне. У заметцы пісалася, што Бягомльскі РВК з верасьня мецца 1928 г. не заплаціў грамадзянину Алаю В. за дастаўку лёкамабіля 20 руб. Грамадзянін Алай вымушаны быў хадзіць на працягу 2-х год за 25 вёрст расьпіскамі, якія сьпісаны рэзалюцыямі, каб атрымаць грошы. Факты, паказаныя ў заметцы, пацьвердзіліся. Бягомльская РСІ абвясьціла вымову загадчыку камгасу Асіповічу і прапанавала тэрмінова заплаціць грошы.

Ад'езд інтэрнацыянальнай дэлегацыі піянэраў з Менску ў Азэрбайджан.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Фрунзаўскі РК КП(б)Б. А 6 гадз. увеч. у памяшк. Мен. АК КП(б)Б (3-ці паверх) склікаецца нарада сакратароў вытворчых парткалектываў, цэхячэек, цэхоргаў, гаспадарнікаў, старшынь рабачкомаў і старшынь шэфтаварыстваў (партыйцаў).

***

Вячэрні рабфак. Пачатак заняткаў пасьля зімовых канікул—7 лютага а 6 гадз. Прымаюцца заявы ад жадаючых паступіць на 1 і 2 курсы яўрэйскага аддзяленьня (пры наяўнасьці адпаведнай падрыхтоўкі).

***

Курсы рацыяналізатараў пры Аргбудзе. Вызначаны цьвёрды расклад заняткаў у наступныя чыслы месяцу: 3, 5, 8, 10, 13, 15, 18, 20, 23, 25, 28 і 30 — а 6 гадз. увеч. Слухачы павінны зьяўляцца абавязкова.

З лютага роўна а 7 гадз. увеч. у памяшк. клюбу «Чырвоны Будаўнік» пачынаецца

праверка тэхнічнага апарату ЦП саюзу і клюбу буд унікоў.

Просьба да ўсіх членаў саюзу прыняць актыўны ўдзел у праверцы.

Камісія па праверцы.

АД МЕН. АКК КП(б)Б

Мен. АКК КП(б)Б выклікае для разгляду апэляцый на 6 лютага 1930 г. к 10 гадз. раніцы ў памяшк. Мен. АКК (вул. Энгельса, 28) ніжапамянёных таварышоў: Гуліда М. М. (яч. прыгараднага с.-с.); Крайко А. М. (Сьмілавіцкай партарг.); Шабуневіч А. К. (Вузьдзенскай партарг.); Барэйка І. Х. (Плешчаніцкай партарг.), Васіленка М. С. (Заслаўскай партарг.); Сьцябуля П. С. (Самахвалаўскай партарг.); Баранава П. Т. (5-ты канв. полк); Яллоўскага М. Т. (г. Барысаў); Кажарскую Н. С. (г. Барысаў); Чыхмарова А. Е. (г. Менск); Варановіч Ул. А. (Барысаўскай партарг.); Карпловіч А. Я. (Самахвалаўскай партарг.); Жукаў Т. Я. (яч. ЦКК); Харытонаў А. К. (яч. Менспраўдому); Гінзбург З. І. (яч. Белдзяржстраху); Сілкоў Я. С., Гавцэвіч С. Ю. (яч. Белжылсаюзу). Праезд за свой кошт.

***

Мен. АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне парттройкі, якое адбудзецца 9 лютага 1930 г. а 6 гадз. увеч. у памяшканьні канцэлярыі АКК КП(б)Б наступных таварышоў: Дзенісэвіч В. Ф., Сысоева А. (Халопеніцкай арг.) Чабатарова Ю. Х., Варановіча Я. Ф. Петрашонака В. І., Сялюка М., Прудникава І. Р. (Бягомльскай арг.); Гілевіч С. Т. (Плешчаніцкай арг.); Майсеевіч Я. В. (Пухавіцкай арг.); Стасюка В. А. (яч. службы шляхоў пасажыр.); Панасюка А. Я., Іванова І. П. (яч. службы эксплёатацыі); Акуліча Я. В. (яч. службы руху МБВ чыг.); Быкава С. П. (яч. зав. «Камунар»).

Таксама просьба зьявіцца на пасяджэньне парттройкі сакратароў партячэек г. Менску, да якіх належаць выкліканыя таварышы. Яўка абавязковая і без спазьненьня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Нядзеля, 2 лютага для саюзу саўгандальслужачых. Білеты ў саюзе і мясцкомах.

Э. ТОЛЬЛЕР. ГОП-ЛЯ, ЖЫВЕМ

КЛЮБ ДРУКАРОЎ

ДВА ВЫСТУПЛЕКЬНІ „Сіняй Блюзы“

НЯДЗЕЛЯ 2 ЛЮТАГА

У праграме: сцэны, фельетоны, балет, частушкі і г. д.

Пачатак 1-га сэансу а 8 г., 2-га сэансу—а 10 г.

Білеты ў касе клюбу ад 25 да 45 кап. Каса адчынена ад 5 гадз. увеч.

Увесь чысты даход пойдзе ў фонд калектывізацыі.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС

Звыш праграмы кіно-часопісь Савкіно № 3.

Пачатак роўна а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал

Нямецкі фільм вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.

ВІНАВАТЫ (судовая помылка).

У галоўн. ролі БЭРНГАРД ГЭТЦКЭ.

Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО Пралетарый

Новы амэрыканскі фільм. Вытв. „Парамоунт-фільм“

МОАНА (СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ)

у 7 част.

Пачатак ад 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 г. увеч.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр“

Гістарычны фільм з пралёгам

ДОМ на ВУЛКАНЕ у 6-ці част.

Штодзенна 2 сэансы.

Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена ад 12 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

Апошні баявік Бэрліну

6 ДЗЯЎЧАТ ШУКАЮЦЬ ПРЫТУЛКУ

у гал. ролях: Жані ЮГО, Георг Аляксандр

Пачатак 1-га сэансу—а 6 г. 30 м.
2-га „ —а 8 г. 30 м.
3-га „ —а 10 гадз.

Каса—ад 5 гадз.

З 2-га лютага 1930 г.

СПЫНЯЕЦЦА ПРЫЁМ РЭЦЭПТАЎ Ў АПТЭЦЫ НК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ.

З рэцэптамі зварочвацца ва ўсе астатнія аптэкі.

АПТЭКА НК АХОВЫ ЗДАРОЎЯ ПЕРАЙМЯНОЎВАЕЦЦА Ў ГУРТОВА ДРОБНАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА СКЛАДУ БЕЛМЭДГАНДЛЮ.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“.

Ад панядзелка, 3-га лютага, пасьля кожнага кіно-сэансу гастролі лепшых сатырыкаў ГРОМАВА І МІЛІЧА.

З прычыны вялікага посьпеху — 2-гі ТЫДЗЕНЬ —

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС

Рэжысэр—І. Траўбэрг. Апэратар—Б. Хрэньнікаў, Мастак—Б. Дуброўскі-Эшкэ.

У галоўных ролях: кітайская актрыса—Сан-Бо-ян, С. Мінін, Ля-Дзі-до, І. Арэнін, Чужэван, І. Чарнэ і інш.

Пачатак 1-га сэансу роўна а 7 г., 2-га—8 г. 40 м., 3-га—10 г. 40 м.

КАСА АД 5 ГАДЗІН.

ОТКРЫТ ПРИЕМ на ЗАОЧН. ФОТО- и КИНО-КУРСЫ О. Д. С. ЕС.

(Общество друзей советской кинематографии)

ПО ОТДЕЛЕНИЯМ:

ФОТО отделение

КИНО механиков передвижников

КИНО-сценаристов

КИНО механиков ст. кином. установок

Слушатель может быть зачислен в идущую группу или вновь начинающую. Стоимость обучения за весь курс по отделениям:
1) фото-отделение . . . . 15 руб.
2) кино-механиков передвижников . 15 руб.
3) кино-механиков стационарников . 18 руб.
4) кино-сценаристов . . . . 20 руб.

Подробные сведения даны в проспекте, который высылается по первому требованию за 10-коп. марку. Все запросы и деньги нужно посылать по адресу: Издательство „Геакинопечать“. Москва, 9, Страстной бул., 2-а“ Отдел Заочных Курсов № 83.

Заводакіраўніцтва „ЧЫРВОНЫ ХЭМІК“

ПРАДАЕ АБСТАЛЯВАНЬНЕ

былой махорачнай фабрыкі,

якое складаецца з крашыльных, вальцавых, расьсеўных і аўта-тачыльных станкоў, а таксама электра-маторы з трансмісіямі, моцнасьці 15, 7 і 4 конскія сілы.

Зварочвацца: Менск, Немігская вул., № 12, заводакіраўніцтва «Чырвоны Хэмік».

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва.

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПРАДАЕЦЦА

ва ўсіх кнігарнях, кіёсках, акруговых аддзяленьнях Белдзяржвыдавецтва, і кнігагандлюючых крамах Белкаапсаюза:

А. Горын.—Што сказала XVI партканфэрэнцыя аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Стар. 53, цана 12 кап.

К. Варашылаў.—Сталін і Чырвоная армія. Стар. 46, цана 6 кап.

Сяргейчык.—Што такое першая ўсебепаруская выстаўка сельскае гаспадаркі і прамысловасьці. Стар. 72, цана 30 кап.

Хоцько.—Праграма гуртка па арганізацыі калектыўнай гаспадаркі ў вёсцы. Стар. 96, цана 50 кап.

ХУТКА ВЫЙДЗЕ:

І. Серада.—Пабудова сілосаў, калгасаў і саўгасаў.

Журык.—Пытаньне бэканізацыі ў БССР.

КУРСЫ па падрышэньні кваліфікацыі сакратарска-канцыляроннага складу пры Аргбудзе і саюзе саўгандальслужачых АДНАЎЛЯЮЦЬ ЗАНЯТКІ 2-га лютага а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні 7-й сямігодкі па Камсамольскай вул. д. № 38-40 (ва дварэ).

ПОЛНЫЙ ПЕСЕННИК „БАЯН“

Песни русские старинные, лирические, шуточные, хоровые, девичьи, молодецкие, красноармейские, флотские, революцион., бытовые, разные частушки и мн. др. Цена с пересылкой 1 р. 60 коп. высылает кооператив. т-во „Культура и Знание“ Москва, Политехн. музей, 110.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

АДКРЫЛАСЯ БЕЛАРУСКАЕ ПРАЕКТНА-МАНТАЖНАЕ БЮРО

Аддзяленьня Цэнтральнага Раёну Усесаюзнага Дзяржаўнага Акцыянэрнага Таварыства „ЭЛЕКТРАСЕЛЬСТРОЙ“

Праектна- мантажнае бюро вытварае праектаваньне, мантаж і будаўніцтва ў галіне электрафікацыі і індустрыялізацыі сельскае гаспадаркі, як-та: пабудова электрастанцый, падстанцый, электрацэнтраляй, сетак, унутранае маторнае і асьвятляльнае абсталяваньне ў прадпрыемствах па первічнай апрацоўцы с.-г. прадуктаў.

Свае дзейнасьці Бюро ажыцьцяўляе на аснове наступнае пастановы ЭКАНА СНК БССР ад 21—1—1930 г.

«Прыняць прапазыцыі НКЗему БССР і прадстаўніка Электрасельбуду НКЗ СССР аб арганізацыі ў БССР прадстаўніцтва дзяржаўнага акцыянэрнага т-ва «Электрасельбуд», якое магло-бы выконваць работу па праектаваньні і будаўніцтве сельскіх электрастанцый на дагаворных пачатках і ў якім у асноўным была-б сканцэнтравана сельская электрабудаўніцтва БССР».

Бюро зьмяшчаецца: г. Менск, Савецкая, 71, у памяшканьні НКЗ, другі паверх, пакой № 9.

Адрас для тэлеграм:—Менск, ЭЛЕКТРАСЕЛЬСТРОЙ.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ

Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых каапэрацыйных арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.

Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.

Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп самігодкі. Прыём адбываецца круглы год.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведнае пасьведчаньне.

Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў па чатку кожнага навучальнага месяцу. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапэечныя маркі.

Грошы пераводзяцца па адрасе: Менск, Усякабанк, бяг. рахунак № 683. Усю карэспандэнцыю накіроўваць: Менск Усякабанк, Завочным курсам.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ

МОСКВА 55, 2-ая ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. № 6

Згублена дамавая кніга д. № 19 Хэйфец Ш. Г. на Чырвонай вуліцы. Лічыць несапраўднай.

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка с.-г. арцелі „Ігрыкультура“. Лічыць несапраўднай.

ПРЫБЫЛАСЯ маленькая ПАРАСЯТКА. Пасьля 2-ге лічу сваім. Койдановскі тракт, № 63, кв. 3.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты ад 2 гадзіны дня

Менск, Галоўлітбел № 337.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск.